**Вартавыя паветраных межаў**

СТАР. 3

**Як беларускі звычай да суседзяў трапіў**

СТАР. 6

**І грампласцінкі маюць прыхільнікаў...**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

29 КРАСАВІКА 2014 г. АЎТОРАК № 79 (27689) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Сёння ў Мінску адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета

**Мерапрыемства пройдзе на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў пад старшынствам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, паведамляе БЕЛТА.**

На парадку дня — разгляд ходу работы над праектам дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, а таксама рэалізацыі плана мерапрыемстваў («дарожнай карты») па далучэнні Рэспублікі Арменія да Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі.

Акрамя таго, запланаваны двухбаковыя сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Уладзімірам Пуціным і Нурсултанам Назарбаевым.

■ Міжнародная ацэнка

## МВФ НЕ БАЧЫЦЬ СЭНСУ Ў РЭЗКАЙ КАРЭКЦІРОЎЦЫ КУРСУ РУБЛЯ

### Але раіць зніжаць крэдытаванне, якое субсідуецца

**Учора скончылася чарговая місія МВФ у Беларусі. Кіраўнік місіі Дэвід Хофман падвёў вынікі.**

### Улічваць трэба і будаўніцтва жылля

Мінулы год быў нялёгкім для беларускай эканомікі. Праблем і выклікаў засталося шмат і сёлета. Аднак «улады краіны пачалі карэкціроўку эканамічнай палітыкі». У параўнанні з апошнімі гадамі, па словах Дэвіда Хофмана, паслабляецца акцэнт на абавязковых мэтавых паказчыках росту ВУП і заработнай платы: «Гэта рэалістычны і вітаны падыход. Місія таксама адзначае і падтрымлівае намаганні ўлад па стрымліванні мэтавага крэдытавання ў рамках прынятага нядаўна «плана фінансавання». Ён эфектыўна вызначае абавязковы для выканання агульны ліміт аб'ёмаў субсідаванага крэдытавання, якое прадастаўляецца Банкам развіцця і іншымі банкамі. План з'яўляецца крокам наперад, нават нягледзячы на той факт, што ліміт крэдытавання застаецца празмерна высокім, а для забеспячэння поўнага ахопу таксама неабходна было б уключыць у яго субсідаванае крэдытаванне будаўніцтва жылля. Місія рэкамендуе рэгулярна фарміраваць такі штогадовы план фінансавання, зрабіўшы гэта часткай сістэмы эканамічнай палітыкі ўлад».

### Важна стрымліваць унутраны попыт

«Мы думаем, што эканамічны прагноз, падрыхтаваны і прадстаўлены ўладамі на пачатку года, схільны да рызыкі ў бок зніжэння, — заявіў спадар Хофман. — Летась тэмпы росту эканомікі былі нізкімі. Сёлета мы не бачым перадумоў для больш высокіх тэмпаў. Як вядома, сітуацыя ў рэгіёне складваецца неспрыяльная. Я маю на ўвазе значнае зніжэнне росту расійскай эканомікі, а таксама крызіс ва Украіне, што будзе мець наступствы для эканомікі Беларусі». Кіраўнік місіі нагадаў, што на гэтыя дзве краіны прыпадае каля паловы беларускага экспарту.

Дэвід Хофман пракаментаваў сітуацыю з курсам нацыянальнай валюты. «Як і ў кастрычніку (калі адбыўся мінулы візіт місіі. — **Аўт.**), мы лічым, што большая гнуткасць абменнага курсу дала б пэўныя перавагі. Але я хачу падкрэсліць, што мы не бачым неабходнасці ў рэзкай карэкціроўцы абменнага курсу. Гэта можа адбывацца і паступова. Але вельмі важна, каб гэта суправаджалася адпаведнай макраэканамічнай палітыкай. Напрыклад, неабходна стрымліваць унутраны попыт за кошт адмовы ад павышэння заработнай платы і больш рэзкага скарачэння мэтавага крэдытавання».

### Пра новы крэдыт пакуль размовы не было

Спадар Хофман паведаміў, што для стымулявання ўстойлівага росту па-ранейшаму патрабуюцца глыбокія структурныя рэформы. Місія вітае крокі, якія ўжо былі зроблены, але настойвае, напрыклад, на неабходнасці скарачэння ролі дзяржавы ў эканоміцы, «што павінна ўключаць у сябе хуткую паэтапную адмову ад сістэмы абавязковых мэтавых паказчыкаў для прадпрыемстваў» і іншыя захады.

МВФ працягне цеснае ўзаемадзеянне з уладамі краіны. «Хаця зараз постпраграмны маніторынг фармальна завершаны, паколькі пагашана асноўная частка фінансавання, місія мяркуе вярнуцца ўвосень, каб прадоўжыць дыскусіі па пытаннях эканамічнай палітыкі. Між тым, МВФ будзе далей аказваць падтрымку уладам у рамках рэгулярных візітаў старшага рэгіянальнага пастаяннага прадстаўніка і тэхнічнай дапамогі». Пра новую праграму крэдытавання, па словах спадара Хофмана, пакуль размова не ішла.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**ДАРЭЧЫ**

***Місія Міжнароднага валютнага фонду знаходзілася ў Беларусі ў перыяд з 17 па 28 красавіка 2014 года з мэтай правядзення кансультацыі па артыкуле IV з уладамі краіны. Місія сустракалася з намеснікам Прэм'ер-міністра Пятром Пракаповічам, старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Надзеяй Ермаковай, міністрам эканомікі Мікалаем Снапковым, службовымі асобамі з Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама прадстаўнікамі навукова-даследчых устаноў, бізнесу і дыпламатычнай супольнасці.***

## ХАКЕЙ ДЗІЦЯЧЫМІ ВАЧЫМА

**У памяшканні прэс-цэнтра «Мінск-Арэны» адкрылася выстаўка пераможцаў рэспубліканскага дзіцячага конкурсу малюнкаў «Дзеці малююць хакей», які арганізавалі і правялі Міністэрства інфармацыі, Міністэрства спорту і сталічнае выдавецтва «Рыфтур». На выставе прадстаўлены работы школьнікаў са Слуцка, Салігорска, Магілёва, Грэска, Гомеля, Мінска, Крычава і Крычаўскага раёна.**

— Беларусь ганарыцца тым, што сёлета з'яўляецца гаспадыняй правядзення чэмпіянату свету па хакеі, — сказала на адкрыцці выстаўкі першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч. — Дарэчы, наша краіна адзіная, у якой захаваўся дзіцячы хакейны чэмпіянат «Залатая шайба». А 12 лепшых малюнкаў гэтага конкурсу ўвайшлі ў каталог і на падставе іх на сталічным тэлебачанні створана 12 рэкламных відэаролікаў.

Лепшымі з лепшых на гэтым конкурсе журы прызнала 13-гадовую Інгу Адзярыху са Слуцка і 8-гадовую Паліну Маісеенку з вёскі Сакольнічы Крычаўскага раёна.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

Пераможца (1-е месца) 13-гадовая Інга АДЗЯРЫХА са Слуцка.

Пераможца (1-е месца) сярод дзяцей — 8-гадовая Паліна МАІСЕЕНКА з вёскі Сакольнічы Крычаўскага раёна.



Беларускую зборную юныя мастакі бачаць пераможцай.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## Br14 млн 980,7 тыс.

***была сярэдняя заработная плата ў сакавіку гэтага года ў работнікаў, занятых у дзейнасці, звязанай з вылічальнай тэхнікай. Гэта самая высокая заработная плата ў краіне. Высокая сярэдняя заработная плата ў сакавіку зафіксавана і па такіх відах эканамічнай дзейнасці, як паветраны транспарт, — Br11 млн 506,3 тыс. і фінансавае пасярэдніцтва — Br11 млн 334,5 тыс. Мінск традыцыйна лідзіруе ў Беларусі па ўзроўні сярэдняй заработнай платы. Яна склала ў сакавіку гэтага года Br7 млн 835 тыс. На другой пазіцыі — Мінская вобласць (Br5 млн 545 тыс.), на трэцяй — Гомельская вобласць (Br5 млн 369,9 тыс.).***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9980,00 | ▲ |
| Еўра | 13840,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 864,07 | ▲ |

■ Насуперак Чарнобылю

## «ВЫЖЫЛІ. ЦЯПЕР ПРОСТА ЖЫВЁМ»

**У Валерыя ШЛЯГІ, старшыні Нараўлянскага райвыканкама, значны скачок кар'еры супаў з датай, якой нікому з беларусаў ужо не забыць. 25 красавіка 1986 года яго прызначылі намеснікам старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях. А 26 красавіка быў яго першы дзень на новай пасадзе. Аварыя на Чарнобыльскай станцыі здарылася ў ноч з 25-га на 26-е. Тым не менш для Валерыя Васільевіча першы працоўны дзень прайшоў спакойна. У той час нават кіраўнікоў Нароўлі своечасова не праінфармавалі аб катастрофе. Ён даведаўся, што «нешта ва Украіне здарылася», толькі вечарам, калі знаёмыя вярнуліся з горада Прыпяць, які знаходзіцца на адлегласці 60 км ад Нароўлі.**

— Нашы беларусы часта ездзілі ў Прыпяць па пакупкі — гэты горад вельмі добра забяспечваўся харчаваннем. Яны і паведамілі, што там быццам бы ўзарваўся рэактар. Яны не змаглі трапіць у крамы, усё было зачынена, людзей у горадзе амаль не было, там мылі вуліцы... З 26-га на 27-е супрацоўнікі штаба грамадзянскай абароны выехалі замяраць дазіметрычныя паказанні. Былі зафіксаваны значныя перавышэнні па цэзію, ёду... Вось тады і стала зразумела, што катастрофа адбылася. Праўда, спачатку яе маштабаў ніхто не ўяўляў. Тым не менш ужо 28-га, у панядзелак, у раёне пачалі ёдапрафілактыку сярод дзяцей. Былі рэкамендацыі рабіць ёдную сетку, каб ёд засвойваўся і замяняў радыеактыўны, ёд капалі на цукар, з бальніцы прывозілі прэпараты з ёдам. У канцы красавіка—пачатку мая мы ўжо больш уяўлялі небяспеку.

***— Тым не менш напярэдадні паўсюль прайшлі першамайскія дэманстрацыі...***

— У нас таксама была першамайская дэманстрацыя, але ж школьнікі, якія да яе рыхтаваліся, у апошні момант не сталі ўдзельнічаць. А

дарослыя выйшлі, быў традыцыйны мітынг. Вы ж ведаеце — у той час інфармацыя падавалася дазавана. Потым сюды прыйшлі вайскоўцы-хімікі і супрацоўнікі навуковых інстытутаў. Кожны дзень іх працы даваў новую інфармацыю пра катастрофу. Тое, што мы ведалі па стане на 1 мая і на 10 мая 1986 года, прынцыпова адрознівалася. У Нароўлі і раёне доза знешняга выпраменьвання была 40 мілірэнтгенаў у гадзіну. Заўважце, не мікра-, а мілірэнтгенаў! Гэта вельмі высокая доза.

***— Вам, як настаўніку фізікі па адукацыі, была зразумела небяспека?***

— Мне было зразумела, чаго рабіць нельга. У тых умовах трэба было вучыцца жыць, выконваючы меры перасцярогі. І гэтыя меры «ўвайшлі» ў цела і кроў тых, хто застаўся тут. Чым далей, тым больш народ асэнсоўваў небяспеку і разумеў наступствы. Агульнае кіраўніцтва эвакуацыяй праводзіў рэспубліканскі штаб, які размяшчаўся ў Хойніках. 2 мая пачалося першае адсяленне — я выязджаў з групай дзяцей, эвакуяваных з тэрыторыі Даўлядоўскага сельсавета, што зусім побач з украінскай мяжой. З населеных пунктаў, якія знаходзіліся ў 10 км ад месца аварыі, напрыклад, з вёскі Белая Сарока мы вывозілі нашых дзяцей — спачатку ў санаторый Мазырскага раёна.

СТАР. 2

## Будзе цёпла і суха

### Камфортнае надвор'е захаваецца да пятніцы

**У святочныя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначацца зонай паніжанага атмасфернага ціску, сфарміраванай у цёплай паветранай масе, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Праўда, сёння ўдзень у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ў аўторак складзе ад 18 да 24 градусаў вышэй за нуль. У сераду і чацвер у Беларусі будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень 30 красавіка ў асобных паўднёва-ўсходніх раёнах магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6-13 градусаў, удзень будзе ад 19 да 24 градусаў цяпла.

А вось з пятніцы на тэрыторыю краіны стане паступаць больш халоднае балтыйскае паветра. Актыўны атмасферны фронт у гэты дзень прынясе ў заходнія раёны нашай краіны кароткачасовыя дажджы, а ўдзень магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6-13 градусаў, удзень сіноптыкі абяцаюць ад 13 да 20 градусаў цяпла, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да 21-24 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы, месцамі моцныя дажджы і навальніцы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДВУХ РЫМСКІХ ПАП ПРЫЛІЧЫЛІ ДА СВЯТЫХ

Кіраўнік Рымска-Каталіцкай Царквы Папа Францішак на ўрачыстай цырымоніі ў Ватыкане абвясціў святымі двух сваіх папярэднікаў — самага славутага Папу XX стагоддзя Яна Паўла II, а таксама «чырвонага» Папу Яна XXIII, які падчас халоднай вайны выступіў за мірнае суіснаванне дзяржаў з рознымі сацыяльнымі сістэмамі і заклікаў Кенэдзі не бамбіць СССР. Падзея ўнікальная: упершыню кананізуюцца адразу два рымскія першасвятары, і не багасловы мінулых стагоддзяў, а нашы сучаснікі.

### У ЭСТОНІЮ ПРЫБУДЗЕ АМЕРЫКАНСКІ ДЭСАНТ

У Эстонію з ЗША для сумесных ваенных вучэнняў да канца года прыбудуць 150 дэсантнікаў. Амерыканскія дэсантнікі ўжо прыехалі ў Латвію, Літву і Польшчу. У краінах Балтыі пройдуць традыцыйныя вучэнні «Ваенны шторм», якія пачнуцца 5 мая. Бок, які прыбывае, выказаў жаданне часцей праводзіць ваенныя вучэнні з краінамі Балтыі, аднак не плануе размяшчаць сваіх салдатаў у краіне пастаянна. Генсак НАТА Андэрс Фог Расмусен раней заявіў, што арганізацыя мае намер размясціць ва Усходняй Еўропе дадатковы ваенны персанал для ўзмацнення боегатоўнасці і правядзення вучэнняў, а таксама перагледзець планы па абароне ў сувязі з падзеямі вакол Украіны.

### МЕСЯЦ БЕЗ АЛКАГОЛЮ КАРДЫНАЛЬНА ЗМЯНЯЕ СТАН АРГАНІЗМА

Праведзенае даследаванне Каралеўскага вольнага шпіталя Лондана даказала карысць адмовы ад спіртнога для людзей, якія п'юць ва ўмераным аб'ёме. У сярэднім адмова ад алкаголю на пяць тыдняў дазваляла скінуць 1,5 кілаграма, зменшыць узровень халестэрыну на 5%, узровень тлушчу ў печані на 15%, а паказчыкі цукру амаль на чвэрць, палепшыць рэжым сну і павялічыць актыўнасць на працы. Акрамя таго, печань атрымала магчымасць аднавіцца. Звычайна гепатолагі ўстрымліваюцца ад каментарыяў адносна карысці адмовы ад спіртнога для людзей, якія п'юць ва ўмераным аб'ёме. Як правіла, яны факусіруюцца на праблемах алкаголікаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЛОНДАН СКУПЛЯЮЦЬ РАСІЯНЕ І ЎКРАІНЦЫ

Заможныя грамадзяне Расіі і Украіны сталі актыўней інвеставаць у лонданскую нерухомасць. Па ацэнках рыэлтарскага агенцтва Savills, грамадзяне Расіі ў 2013 годзе інвеставалі каля 180 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (больш за 303 мільёны долараў) у лонданскі рынак жылля. Шматлікія агенцтвы чакаюць, што ў 2014-м гэты паказчык можа істотна павялічыцца. Раней жыхары брытанскай сталіцы патрабавалі абмежаваць продаж нерухомасці багатым замежным пакупнікам. Попыт з боку мільянераў падтрымлівае рост кошту на нерухомасць у Лондане. З-за гэтага мясцовыя жыхары сталіцы магчымасць купіць сабе жыллё. Пакуль не вельмі ясна, як улады могуць абмежаваць продаж жылля замежнікам, бо сталіца Вялікабрытаніі з'яўляецца найбольш папулярным горадам сярод людзей, чыё багацце вылічаецца мільярдамі долараў. У сярэднім у 69% купляў на рынку нерухомасці Лондана пакупнікамі з'яўляюцца замежнікі, а 28% наогул не жывуць у Вялікабрытаніі. Па выніках першых трох месяцаў бягучага года цэны выраслі на 18%, дасягнуўшы каля 363 тысяч фунтаў стэрлінгаў за адзін аб'ект.

КАРОТКА

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў цэлым па Мытным саюзе ў сакавіку 2014 года склаў 1,1%.

Нацбанк Беларусі прапануе пашырыць пералік аб'ектаў, у якіх абавязкова ўстаноўка плацежных тэрміналаў, уключыўшы ў яго санаторыі, дамы адпачынку, аздараўленчыя цэнтры, аўтамабілі-таксі, дыягнастычныя станцыі па аглядзе транспартных сродкаў.

Каля 4 тыс. гледачоў прысутнічалі на паказе спектакля «Лебядзінае возера» ў выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, які 26 красавіка пры поўным аншлагу адбыўся ў Парыжы.

Вікторыя Азаранка засталася на 4-й пазіцыі ў суветным рэйтынгу лепшых тэнісістак, а яе вяртанне на корт зноў адкладзена.

Беларуская дэлегацыя адправілася ў Капенгаген на міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне-2014», усяго ў камандзе 23 чалавекі.

■ Радзіннае

## ПАХРЫСТОСАВАЦЦА З БЛІЗКІМІ

**Першыя дні пасля Вялікадня на Беларусі — час асаблівы. Куды б нас ні закінуў лёс, мы пасля свята — хто ў чацвер, хто ў нядзелю, хто на дзявяты дзень — на Радаўніцу, — спяшаемся да родных магіл. Бо трэба ж пахрыстосавацца з дарагімі нябожчыкамі, «разбудзіць» іх, расказаць, што прыйшла вясна, падзяліцца навінамі пра сям'ю: хто ажаніўся, хто нарадзіўся. Прыбрацца на могілках, успомніць са светлым сумам тых, каго ўжо няма, сустрэцца з землякамі і сваякамі, якіх не бачыў цэлы год. Інакш проста нельга. Менавіта ў нашай мове і нездарма Радзіма, Род, Радаўніца і Радасць — словы калі не аднакарэнныя, то вельмі сугучныя...**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Меркаванне

# НА ШЛЯХУ ДА ЕЎРАЗІЙСКАГА ЭКАНАМІЧНАГА САЮЗА

## Сёння адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў

**Значэнне сустрэчы эпахальнае: як вядома, на пасяджэнні ВЕЭС 24 снежня 2013 года было вырашана, што тэкст дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) павінен быць гатовы да падпісання да 1 мая 2014 года, а затым ён паступіць у парламенты. У той жа час не ўсё так проста.**

У апошнія тыдні беларускаму боку ніяк не ўдавалася ўзгадніць з расійскім адмену мытных пошлін, якая планавалася раней, на выкарыстанне з расійскай нафты нафтапрадукты для беларускай эканомікі з 1 студзеня 2015 года. А ў 2013 годзе вышэйшымі службовымі асобамі Расіі фактычна было дадзена абяцанне вырашыць гэтае пытанне станоўча.

У прыватнасці, 24 кастрычніка 2013 года першы намеснік старшыні ўрада РФ Ігар Шувалаў, абмяркоўваючы пытанне аб адмене пошлін, адзначыў, што Масква гатова да адмены гэтых абмежаванняў, заявіўшы: «Гэта азначае, што з 1 студзеня 2015 года для Беларусі не будуць прымяняць экспартныя пошліны».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы 16 красавіка з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, адзначыў: «Калі мы будуем саюз і імкнёмся да таго, каб тут не было ніякіх межаў, значыць не павінна быць ніякіх выключэнняў і абмежаванняў у руху тавараў, працоўнай сілы, капіталу».

**Вышэйназваныя праблемы не з'яўляюцца падставай для завяршэння еўразійскай інтэграцыі. Якраз гэта — стымул для таго, каб прымаць сур'ёзныя вывераныя рашэнні, здольныя даць новы імпульс для развіцця эканомікі Беларусі, Расіі і Казахстана.**

Тую ж пазіцыю Прэзідэнт агучыў і адказваючы на пытанні парламентарыяў пасля штогадовага Пасланння беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу: «Калі не гатовы сёння падпісваць дагавор аб эканамічным саюзе, а праз 10, а хтосьці прапануе і 15 гадоў гэтыя пытанні вырашаць, ну тады і падпішам». Такім чынам, гэтае пытанне становіцца найважнейшым для абмеркавання падчас сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў «тройкі» на вышэйшым узроўні 29 красавіка. Зыходзячы з гатоўнасці Расіі яго вырашыць або прапанаваць што-небудзь раўнацэннае па значнасці ўзамен, будзе вызначацца і намечанае раней захаванне тэрмінаў па фарміраванні ЕАЭС.

Безумоўна, пэўныя пытанні ў абмеркаванне еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў прыўнясе і эканамічная дэпрэсія, якая ўжо шэсць гадоў панае ў еўрапейскім рэгіёне. Яе наступствы адчувальныя як для развіцця беларускай, так і расійскай эканомік, асноўныя каналы збыту прадукцыі якіх арыентаваны на еўрапейскую частку Еўразіі. Так, калі ў 2012 годзе эканамічны рост Расіі склаў 3,4%, то па выніках 2013 года запаволіўся да 1,3%.

Аналагічная сітуацыя назіралася і ў Беларусі. Калі па выніках 2012 года беларуская эканоміка выраслa на 1,7%, то ў 2013 годзе — на 0,9%. Трывожная сітуацыя складваецца і па выніках першага квартала 2014 года. Расійская эканоміка выраслa на 0,8%, а беларуская — на 0,5%.

Лепш выглядае Казахстан, размешчаны ў Азіі, якая пасля негатыву першых гадоў сусветнага крызісу хутка вярнулася да мадэлі ўпэўненага росту. У 2012 годзе ВУП краіны павялічыўся на 5%, а ў 2013 — на 6%. Праўда, па выніках першага квартала 2014 года казахстанская эканоміка таксама запаволілася да 2,9%.

Выклікае пэўную трывогу і падзенне тавараабароту. Так, у знешнім гандлі тавараварот краін МС скараціўся па выніках 2013 года на 0,4%, пры гэтым экспарт упаў на 1,4%, а імпарт вырас на 1,4%. Калі ў 2012 годзе аб'ём узаемнага гандлю дзяржаў-членаў Мытнага саюза склаў 68,6 мільярда долараў, павялічыўшыся ў параўнанні з 2011 годам на 8,7%, то ў 2013 годзе тавараварот у рамках МС скараціўся да 64,1 мільярда долараў.

Няпростай становіцца і сітуацыя ў стасунках Расіі з Захадам, што таксама будзе негатыўна адбівацца на расійскай эканоміцы, і, апасродкавана, на ўсіх удзельніках еўразійскай інтэграцыі. Пастаянныя пагрозы новых санкцый нервуюць айчынных бізнесменаў і прымушаюць замежных інвестараў замарожваць інвестыцыі.

Вядома, усе вышэйназваныя праблемы не з'яўляюцца падставай для завяршэння еўразійскай інтэграцыі. Якраз гэта — стымул для таго, каб прымаць сур'ёзныя вывераныя рашэнні, здольныя даць новы імпульс для развіцця эканомікі Беларусі, Расіі і Казахстана. Неабходна сумесна ствараць новыя вытворчасці на аснове сучасных тэхналогій, якія будуць замяшчаць прадукцыю, якая паступае на тэрыторыю Мытнага саюза з трэціх краін.

Праблемы з эканамічным ростам лепш за ўсё вырашаць менавіта гэтым шляхам — калі цяжка збыць свае тавары за мяжой, трэба зарабляць, выпускаючы для свайго рынку тавары, якія раней імпартаваліся. Менавіта ў гэтым заключаецца сэнс настойвання Беларуссю на адмене ўсіх выключэнняў — каб на еўразійскім рынку сталі актыўна перамяшчацца з краіны ў краіну капіталы і тэхналогіі, неабходна стварыць для гэтага ўмовы, якія ўключаюць у тым ліку роўны доступ да прыродных рэсурсаў.

Гэта дазволіць кожнай з эканомік на роўных канкурыраваць за прыцягненне інвестараў для стварэння імпартазамяшчальных вытворчасцяў і ўкаранення новых тэхналогій. Сённяшняя сітуацыя, калі існуе мноства выключэнняў, інвестыцыям і інавацыям не спрыяе.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

# «ВЫЖЫЛІ. ЦЯПЕР ПРОСТА ЖЫВЁМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вельмі цяжкая была сітуацыя, усе плакалі: і бацькі, і дзеці. Бо толькі самыя малыя выязджалі разам з маці... Паток руху транспарту быў вельмі вялікі. Калоны ішлі і ў адзін, і ў другі бок. Тое, што можна было несці, людзі забіралі з сабой: самае каштоўнае, адзенне і ежу. А тэлевізары, халадзільнікі, мэблю пакідалі пад ахову ўнутраных войскаў. Жывёлу здавалі цэнтралізавана і вывозілі на фермы.

**— Гэта было сапраўднае «баявое хрышчэнне» для вас...**

— Так, а потым было яшчэ адно вялікае адсяленне дзяцей з усяго раёна — 7-9 мая. 6 мая мы сабраліся ноччу, размеркавалі супрацоўнікаў адукацыі і аховы здароўя для суправаджэння. Дзяцей збіралі ўсю ноч, прыходзілі аўтобусы з усёй вобласці, і з 4—5 раніцы пачалася адпраўка. Але як толькі ад'ехала ад горада першая калона, з патрульнага верталёта ДАІ перадалі каманду прыпыніць рух. 50 аўтобусаў сталі на ўзбочыне ўздоўж лесу. Я вярнуўся ў Нароўлю, у раённы штаб. Начальнік штаба ГА звязаўся са старшынёй аблвыканкама Аляксандрам Адамавічам Грахоўскім, які ўзначальваў абласны штаб. Мы яму расказалі, што з рэспубліканскага штаба паступіла каманда спыніць аўтобусы. Гэты мужны чалавек кажа: «Я вам даю каманду працягваць адсяленне дзяцей!». Тады я вярнуўся да калоны і мы працягвалі рух. Гэтых дзяцей вывозілі ў розныя піянерскія лагеры Гомельшчыны. У той час, пакуль была неразбярыха, некалькі аўтобусаў вярнулі назад. Таму адсяленне людзей працягвалі 8 і 9 мая. У апошні дзень мы выязджалі ў тыя населеныя пункты, дзе бацькі адмовіліся аддаць сваіх дзяцей. Прыходзілася рознае выслухоўваць. Дзе атрымлівалася — пераконвалі, дзе не атрымлівалася — забіралі дзяцей сілай, тэрмінова адпраўлялі на аздараўленне... Наступнае, поўнае адсяленне дарослых на больш далёкія тэрыторыі, было ўжо 2 чэрвеня. Я адказваў за жыхароў вёскі Бук Дзёрнавіцкага сельсавета. Тады мы вывозілі не толькі насельніцтва, але і маёмасць са школ. І яшчэ адсяленне было ў жніўні—верасні—кастрычніку 1986 года. На гэты раз людзям дазвалялі забіраць з сабой частку маёмасці. Я адказваў за населеныя пункты Цешкаў і Карпавічы — людзей адтуль адсялялі ў Чачэрскі раён.

З пазіцый сённяшняга дня, не патрэбна было такое масавае — трэцяе — адсяленне людзей. Жыхары Цешкава і Карпавіч праз год-паўтара сталі актыўна пісаць ва ўсе інстанцыі — так хацелі вярнуцца. З вёскі Грыдні амаль усе людзі вярнуліся назад у тым жа, 1986 годзе. Да наведвання кіраўніком дзяржавы гэтая вёска жыла як самасёлы, а пасля людзей там зарэгістравалі, і сёння яны жывуць законна. На свой страх і рызыку, нягледзячы на забароны, вярталіся самасёлы ў вёску Белы Бераг.

Памятаю, як летам 1986 года я вазіў па Жлобінскім раёне нашых жыхароў з вёсак Углы і Даўляды. Яны хацелі падабраць месца для будоўлі новых дамоў, падобнае на тое, дзе яны раней жылі. Аглядаем вёскі Ніжняя Алба, Верхняя Алба, а яны кажуць: «Сенажаць прыгожая, але ж у нас была прыгажэйшая». Людзі доўга жылі надзеяй вярнуцца да сваіх родных месцаў.

**— Калі ўсё ж прыйшло ўсведамленне таго, як трэба жыць далей?**

— 90-я гады былі нестабільнымі ўвогуле. Сама ідэя захаваць жыццё на нашых тэрыторыях рэальна прыйшла толькі разам з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. Да гэтага вяліся размовы пра ліквідацыю, поўнае адсяленне, аб'яднанне раёна з іншымі... Але кожнае наведванне Прэзідэнтам гэтых земляў давала надзею і стымул для захавання і развіцця. З 1996 года я быў прызначаны старшынёй Нараўлянскага райвыканкама. У 1996—1997 гадах стала дакладна зразумела пазіцыя дзяржавы ў дачыненні да праблем Чарнобыля. Толькі падтрымка гэтых тэрыторый дазволіла захаваць раён.

**— Але ж гэта ўжо зусім іншы раён, які страціў многае...**

— У 1986 годзе тут пражывала амаль 28 тысяч чалавек. Гэта быў паўнацэнны раён з добрымі кадрамі. Самымі складанымі для нас былі 1995—1997 гады. Мне, як намесніку старшыні трэба было думаць, як ажыццяўляць функцыянаванне сацыяльнай сферы і гандлю, як захаваць школу ў вёсцы, дзе палова дзяцей выехала, а палова засталася... А тыя, хто адказваў за адсяленне, думалі, як выселіць астатніх. Вось такая супярэчнасць. Да 1996-97 гадоў у нас заставалася прыкладна 10 тысяч насельніцтва: 5 тысяч у горадзе і столькі ж — на вёсцы.

**Дзе атрымлівалася — пераконвалі,**
**дзе не атрымлівалася — забіралі дзяцей сілай,**
**тэрмінова адпраўлялі на аздараўленне.**

Да таго ж у сярэдзіне 90-х пачалося інтэнсіўнае скарачэнне прадпрыемстваў — былі спробы закрыць амаль усю вытворчасць. У той час мы зрабілі ўсё, каб захаваць тыя прадпрыемствы, якія маглі працаваць, у тым ліку горадаўтваральную кандытарскую фабрыку «Чырвоны мазыранін». Атрымалася адстаяць мясцовае прафтэхвучылішча і завод гідраапаратуры. У другой палове 90-х эканоміка стала паступова выпраўляцца. Безумоўна, вялікі ўклад унесла навука. Нам падказвалі, што трэба рабіць, каб захаваць сельскагаспадарчую вытворчасць, якія культуры вырошчваць... На жаль, перавялі на іншыя тэрыторыі ПМК меліярацыі, будаўнічыя і іншыя арганізацыі, якія сёння маглі б стварацъ добры будаўнічы комплекс у раёне.

**— У той час на Нараўляншчыне шмат земляў было выведзена з севазвароту... Сельскагаспадарчая вытворчасць у 1990 годзе ажыццяўлялася на 19,5 тысячы га сельгасугоддзяў.**

— Практычна столькі і сёння. Мы рабілі спробы вярнуць землі, але ж трэба ўлічваць і тое, што значна зменшылася колькасць працаўнікоў. Да таго ж, вырабленая прадукцыя балансавала на мяжы дапушчальных узроўняў радыяцыі — каму такое патрэбна? Таму мы не пайшлі па гэтым шляху. Сёння ў грамадскай жывёлагадоўлі практычна не бывае выпадкаў перавышэння канцэнтрацыі радыенуклідаў у малацэ. У прыватным сектары значна зменшана пагалоўе кароў — каб не было ўвогуле ніякай рызыкі. Мы дабіваліся вяртання земляў для іншых мэтаў. Тут вельмі прыгожая прырода, сюды многія хацелі б прыязджаць для рыбалкі і адпачынку. Мы хацелі б тут развіваць экалагічны турызм, стварыць пляцоўкі, з якіх людзі б назіралі за флорай і фаўнай гэтага краю.

Вельмі шмат сёння ахвотных на свае вочы пабачыць або сфатаграфаваць гэтыя мясціны. Ва Украіне горад Прыпяць сёння вельмі запатрабаваны як турыстычны аб'ект. Але ж мы не атрымалі дазволу на развіццё гэтага віду дзейнасці, хоць было некалькі інвестыцыйных праектаў.

Храм у Нароўлі.

**— Якія планы на будучыню?**

— Сёння Нароўля і Нараўлянскі раён жыве, а не выжывае. За апошнія пяць гадоў мы шмат пабудавалі ў вытворчай і сацыяльнай сферах. У нас з'явіліся 4 добрыя аб'екты ў сельскай гаспадарцы. Пяты — новая свінатаварная ферма — будзе таксама хутка здадзены. З 2009 года мы вельмі інтэнсіўна сталі будаваць жыллё. Усе спецыялісты забяспечаны ім на перыяд працы ў раёне. Вядома, ёсць аб'ектыўныя прычыны, якія не даюць нам стаць на ўзровень астатніх — у тым ліку адток працоўных рэсурсаў. Але ж мы робім усё, каб максімальна наблізіцца ў сваім сацыяльным і эканамічным развіцці да ўзроўню сярэдніх раёнаў рэспублікі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ ПАВЫШАНЫ НА 7,5%

**З 1 мая вырастуць памеры мінімальных пенсій і некаторых дзяржаўных дапамог.**

Пастановай Савета Міністраў №387 ад 24 красавіка заканадаўча зацверджаны новы бюджэт пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах сакавіка бягучага года ў пералічэнні на адзін месяц.

Новы памер бюджэту пражыткавага мінімуму (БПМ) будзе складаць у сярэднім на душу насельніцтва 1 212 470 рублёў. У прыватнасці, для пенсіянераў новы памер БПМ будзе роўны Br1 031 330, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br1 027 090, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — Br1 328 760, для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — Br1 326 710, для дзяцей-студэнтаў — Br1 236 240. А вось для працаздольнага насельніцтва нарматыў устаноўлены ў памеры 1 357 440 рублёў.

Паколькі БПМ азначае гранічны ўзровень даходаў, то адпаведнае павышэнне на 7,5% чакае ў тым ліку як памеры мінімальных працоўных і сацыяльных дапамог, так і надбаўкі да іх.

Вырасцуць і памеры некаторых відаў дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Пры нараджэнні першага дзіцяці аднаразовая выплата, якая складае 10 БПМ, павысіцца да 12 мільёнаў 124 тысяч 700 рублёў. Калі ж у сям'і адбылося новае прыбаўленне, то памер дапамогі складзе 16 мільёнаў 974 тысячы 100 рублёў.

Закране новаўвядзенне і асобныя катэгорыі сем'яў, вызначаныя заканадаўствам. Так, штомесячная дапамога на дзіця, інфіцыраванае ВІЧ, складзе 848 700 рублёў. Такую ж суму атрымаюць сем'і, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід, пры гэтым памер дапамогі на іншых дзяцей дасягне аднакі 606 200 рублёў. Удвая большая сума выплаты рэгламентавана па доглядзе дзяцей з інваліднасцю.

Новыя сацыяльныя нарматывы будуць дзейнічаць да 31 ліпеня ўключна.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ПАМІНАЦЬ, А НЕ «ЗЛОЎЖЫВАЦЬ»

**На Радаўніцу большасць мінчан па традыцыі наведае месцы пахаванняў, размешчаныя ў горадзе і за яго межамі. У сувязі з гэтым сталічная міліцыя зверне павышаную ўвагу на ахову грамадскага парадку і забеспячэнне бяспекі дарожнага руху.**

Непасрэдна на тэрыторыі горада размешчана 17 могілак. Апроч забеспячэння асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, супрацоўнікі міліцыі будуць арганізоўваць дадатковыя парковачныя месцы ў месцах масавага знаходжання людзей. Асаблівая ўвага будзе нададзена Усходняму і Чыжоўскім могілкам. На прылеглых да іх участках адпаведна праспекта Незалежнасці і МКАД плануецца абмежаваць хуткасць руху транспарту, а таксама арганізаваць дадатковыя парковачныя месцы. Акрамя таго, цягам дня будзе арганізаваны часовы наземны пешаходны пераход да Чыжоўскіх могілак.

З улікам масавай міграцыі мінчан за межы горада дадатковыя сілы супрацоўнікам Дзяржаўтаінспекцыі будуць прыцягнуты да месцаў выезду з горада. ГУУС Мінгарвыканкама звяртае ўвагу гараджан і гасцей сталіцы на неабходнасць умеранага ўжывання спіртнога, а таксама нагадвае аб забароне ўжывання алкагольных напояў, у тым ліку піва, у грамадскіх месцах.

## ПЕРАНОС ПАЎПЛЫВАЕ НА ГРАФІК

**Як будзе арганізавана работа гарадскога пасажырскага транспарту ў сувязі з пераносам рабочых дзён у красавіку-маі?**

У дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс» патлумачылі, што аўтобусныя маршруты 29-30 красавіка, 1 і 9 мая будуць арганізаваны па графіку нядзельных дзён. Тралейбусныя маршруты 29-30 красавіка і 9 мая будуць працаваць, як па суботах, а 1 мая — па нядзельным графіку. Трамвайныя маршруты 20-30 красавіка, 1 і 9 мая будуць перавозіць пасажыраў, як па нядзелях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АПЕРАЦЫІ «БАГРАЦІЁН» ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Памятны знак, прысвечаны юбілею пачатку аперацыі «Багратіён», будзе ўсталяваны на 71 кіламетры рэспубліканскай трасы Р-31 «Бабруйск—Мазыр».**

Яго аўтар — гомельскі скульптар Валерый Кандраценка. Адліты ў бронзе манумент вышынёй звыш шасці метраў будзе заўважны здалёк. Ён нагадае пра падзеі 24 чэрвеня 1944 года, калі менавіта з тэрыторыі Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці пачыналася аперацыя «Багратіён» па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Як расказала намесніца начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Светлагорскага райвыканкама Людміла Грабко, памятны знак плануецца адкрыць у другой палове чэрвеня. На ім размешчаны барэльефныя партрэты легендарных палкаводцаў Георгія Жукава, Канстанціна Ракасоўскага, Паўла Батава, Міхаіла Панова, а таксама эпізоды, якія адлюстроўваюць пачатак аперацыі «Багратіён». Праектна-каштарысная дакументацыя па ўстаноўцы памятнага знака выраблена за кошт сродкаў, сабраных падчас раённага суботніка. Будаўніча-мантажныя работы і добраўпарадкаванне тэрыторыі ажыццяўляюцца за кошт спонсарскіх сродкаў.

Сёлета для рамонту пахаванняў, помнікаў, надмагільных пліт распараджэннем старшыні Гомельскага аблвыканкама было выдаткавана Br600 млн, за якія плануецца капітальна адрамантаваць 19 аб'ектаў. На двух вайсковых могілках будуць пастаўлены помнікі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ВЫРАСЛА КОЛЬКАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ МІГРАНТАЎ З РОЗНЫХ КРАІН

**За студзень — сакавік у Мінску грамадзянам Кітая афармлена 1410 спецыяльных дазволаў на занятак працоўнай дзейнасцю. Гэта на 1287 больш, чым за аналагічны леташні перыяд.**

Як паведаміў начальнік упраўлення па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Дарашчонак, павялічылася таксама колькасць працоўных мігрантаў з Украіны (696 супраць 388), Узбекістана (363 і 125), Літвы (291 і 154), Грузіі (109 і 58), Малдовы (44 і 20). Менш мігрантаў з Турцыі (376 супраць 433) і Латвіі (31 супраць 66). Усяго за квартал гэтага года ў сталіцы афармлена 4007 спецыяльных дазволаў замежнікам на занятак працоўнай дзейнасцю, анулявана — 3019.

**Любоў ЯГОРАНКАВА,** *«Мінск-Навіны»*.

■ Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

# УЛАСНАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

**Ужо шмат гадоў запар напярэдадні знакавых для Беларусі дат, у якіх увасабляецца як наш смутак і лёс выпрабаванняў, так і наша воля, дух і гонар — гадавіны чарнобыльскай трагедыі і Дня Перамогі, кіраўнік дзяржавы звяртаецца з традыцыйным Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу.**

Такое выступленне Прэзідэнта заўжды з'яўляецца ўрадлівай глебай для працы аналітыкаў, журналістаў, дыпламатаў, бо ўяўляе сабой не толькі ўласна думкі беларускага лідара, але і вынік высілкаў найлепшых айчынных спецыялістаў, што па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі збіралі і прадастаўлялі неабходную фактуру. Па тэкстах гэтага дакумента можна дакладна вызначыць напрамкі будучага развіцця краіны, асноўныя каштоўнасці беларускага грамадства, а таксама вострыя праблемы, што стаяць перад кіраўніцтвам.

Моцным стрыжнем апошняга Пасланння Прэзідэнта была тэма суверэннага развіцця, незалежнасці Беларусі, унутранай еднасці нашага народа. «У любой сітуацыі мы павінны любымі сродкамі адстаяць галоўную нашу каштоўнасць — незалежнасць нашай краіны, святое права жыць на ўласнай зямлі і распараджацца сваім лёсам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт не мог абмінуць увагай трывожную міжнародную абстаноўку, што склалася ў сучасным свеце, загадзя папярэдзіўшы суайчыннікаў, што геапалітычныя катаклізмы ва Усходняй Еўропе абавязкова закрануць і Рэспубліку Беларусь. Найбольш дзейснымі мерамі прафілактыкі, згодна з беларускім лідарам, мусяць быць: адзінства грамадства, правільныя высновы з уласнай гісторыі і памылак нашых суседзяў, ясны праект будучыні Беларусі, які аб'яднае і натхніць як моладзь,так і старэйшае пакаленне.

## ЗАСВОЕНЫ ЎРОК

Відавочна, што пад геапалітычнымі катаклізмамі Аляксандр Лукашэнка меў на ўвазе палярызацыю сучаснага свету, падзеі вакол Украіны, дзе мощныя дзяржавы амаль у адкрытую ладзяць свае гешэфты, практычна не звяртаючы ўвагі на нацыянальны ўрад гэтай дзяржавы. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што не толькі знешнія фактары сталі прычынай запляду нашай паўднёвай суседкі, але, у першую чаргу, фактары ўнутраныя — татальная карупцыя ды занядбанасць эканомікі.

Украінскі ўрок добра засвоены беларускім кіраўніцтвам — менавіта на ўнутранай чысціні дзяржаўнай службы і эканамічных дасягненнях мусіць базавацца незалежнасць нашай Айчыны. «Моцная эканоміка і сумленная ўлада — гэта фундамент незалежнай Беларусі і квітнеючай нацыі» — адзін з найбольш выразных тэзісаў звароту Прэзідэнта.

**Такія жорсткія захады не падабаюцца ліберальным колам, але даюць свой плён: краіна стабільна развіваецца, а беларускі народ па-ранейшаму крочыць суверэнным шляхам.**

Цягам Пасланні былі анансаваны яшчэ больш жорсткія захады па працягу барацьбы з карупцыяй і перспектыўныя рашэнні па стымуляцыі развіцця эканомікі. Яшчэ ў 1994 годзе Аляксандр Лукашэнка быў абраны Прэзідэнтам Беларусі менавіта на антыкарупцыйнай хвалі. За гэты час кіраўнік дзяржавы ні на крок не змяніў сваёй першапачатковай пазіцыі і курсу. Крылаты выраз вядомага кінагероя Глеба Жыглова «Злодзей павінен сядзець у турме» цалкам характарызуе беларускую палітыку ў барацьбе з арганізаванай эканамічнай злачыннасцю. Такія жорсткія захады не падабаюцца ліберальным колам грамадства, але нязменна даюць свой плён: краіна стабільна развіваецца ў сучасным вірлівым свеце, а беларускі народ, нягледзячы на высілкі знешніх «памагатых», па-ранейшаму крочыць суверэнным шляхам і давярае свайму лідару, бо бачыць канкрэтныя вынікі дзяржаўнай працы. «Справа тут не ў амерыканцах. Амерыканцы і ў нас у свой час давалі парады: і да 2010 года, і ў 2010-м... Але, напэўна, не так, як ва Украіне... Яны дакладна разумеюць, што сёння не той час, сёння Беларусь не перакуліш... У аснове ўсяго гэтага пераварот ляжыць толькі адно пытанне — эканоміка. Будуць працаваць нашы прадпрыемствы — нам не страшны ніякі вораг, ніякія танкі, ніякія самалёты!» — заявіў Прэзідэнт.

«Шляхам здаровага сэнсу» назваў Аляксандр Лукашэнка айчынную эканамічную палітыку, што і надалей будзе скіравана на захаванне сацыяльнай справядлівасці, аднак дзяржаўная падтрымка не стане «дармавым хлебам» для гультаёў і трутняў, але найперш будзе прызначана тым, каму яна сапраўды патрэбна — маладым сем'ям, вучоным, асобным катэгорыям бюджэтнікаў.

## ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ — ВЫКЛІК І МАГЧЫМАСЦЬ

Асобныя словы Прэзідэнт прысвяціў найважнейшаму пытанню знешняй палітыкі — праблематыцы еўразійскай інтэграцыі. Па вялікім рахунку, практычна кожны тэзіс з выступлення кіраўніка краіны можна было разглядаць з пазіцый удзелу Беларусі ў гэтым грандыёзным праекце. Зразумела, што век нацыянальных дзяржаваў даўно скончыўся і настае час «новых імперый» — глабальных эканамічных і палітычных наднацыянальных блокаў, прычым толькі ўдзел у падобным утварэнні з аб'ёмам рынку не менш за 250 млн чалавек можа гарантаваць якаснае развіццё ў будучыні. Але фундаментальным застаецца той факт, што Беларусь, моцная і суверэнная, мусіць бараніць свае інтарэсы на інтэграцыйным шляху і дамагацца ад партнёраў выкання дасягнутых дамоўленасцяў. Безразважна кідацца ў любыя прапановы, нібы у калодзеж з галавой, беларуская дзяржава, відавочна, не стане.

Ясна, што любыя аб'яднальныя ініцыятывы мусяць быць падмацаваны эканамічным сэнсам. Для беларускай экспартна-арыентаванай, індустрыяльна-перапрацоўчай эканомікі гэткім сэнсам з'яўляецца стварэнне Адзінай эканамічнай прасторы без выключэнняў і абмежаванняў, калі беларускія вытворцы атрымліваюць свабодны доступ да сыравіннай базы саюзнікаў. Такія дамоўленасці былі дасягнуты яшчэ ў 2012 годзе, але незразумелым чынам інтэграцыйны цягнік па-ранейшаму стаіць на запасным шляху. Кожны год Беларусь пералічвае ў бюджэт Расіі 3,5-4 млрд долараў ЗША экспартнай пошліны за нафтапрадукты, выпрабленыя на айчынных заводах з расійскай сыравіны.

Звяртаючыся да партнёраў з Расіі і Казахстана, Прэзідэнт падкрэсліў немэтазгоднасць удзелу Рэспублікі Беларусь у Еўразійскім саюзе без уліку нацыянальных і эканамічных інтарэсаў нашай дзяржавы: «Яшчэ 2,5 года таму мой расійскі калега Уладзімір Пуцін абяцаў з 1 студзеня 2015 года пайсці на ліквідацыю выключэнняў і абмежаванняў. Сёння Расія ад гэтай пазіцыі адышла, Казахстан сваім прыярытэтам назваў далучэнне да Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Беларусь жа ўвесь час трымалася дасягнутых дамоўленасцяў. Нашым сябрам і калегам трэба вызначыцца, хочуць яны ствараць гэты саюз ці не? Калі так, то трэба яго ствараць на схаластычных асновах. Давайце прыбярэм усе выключэнні і абмежаванні. Але калі сёння гатовы толькі падпісаць дагавор, а абмежаванні прыбраць праз гадоў 10-15, то тады і падпішам».

## ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ

Такая жорсткая, але справядлівая пазіцыя выглядае цалкам слушна з улікам нацыянальных інтарэсаў беларускага народа і падмацавана прыкладамі з нашай гісторыі. У XVI стагоддзі кіраўнічая эліта ВКЛ зрабіла канчатковы выбар на карысць інтэграцыйнага праекта з Польшчай — так узнікла Рэч Паспалітая — «супольная справа», «саюз Кароны і княства» з вельмі моцнымі перавагамі для польскага боку і практычна без уліку інтарэсаў праваслаўных славянскіх і балцкіх зямель ВКЛ. Зразумела, што з такой зусім не агульнай «супольнай справы» наўрад ці мог атрымацца эфектыўны праект: спачатку, пасля доўгай вызваленчай вайны, аддзялілася Украіна, а праз некаторы час старабеларуская мова ў «дзяржаве двух народаў» была пазбаўлена афіцыйнага статусу. Менавіта тая, першапачатковая няроўнасць, закладзеная Люблінскім дагаворам 1569 года, прывяла Рэч Паспалітую да ўнутраных супярэчнасцяў, што літаральна разарвалі гэтае ўтварэнне і сталі асноўнай прычынай яго ліквідацыі больш моцнымі суседзямі. Для беларускага грамадства пачаўся доўгі перыяд перыферыйнага развіцця, які быў спынены толькі ў 1919 годзе з утварэннем БССР.

Такім чынам, маючы як найвышэйшае дасягненне ўсіх пакаленняў суб'ектную суверэнную Рэспубліку Беларусь, паўтарыць памылкі гісторыі ні наш народ, ні вышэйшае кіраўніцтва проста не маюць права. Як сказаў Прэзідэнт, «занадта доўгім быў наш гістарычны шлях да незалежнасці. Занадта шмат крыві пралілі нашы дзяды і прадзеды за права жыць на сваёй зямлі і распараджацца ўласным лёсам».

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ**

■

■ Па-чалавечы

# З ЧУЛАСЦЮ ДА КАЛЕГІ

**У хуткім часе будзе адзначацца 90-гадовы юбілей народнага пісьменніка Беларусі Васіля Уладзіміравіча Быкава. Ужо пасля смерці выдатнага творцы неаднойчы згадваліся факты з яго жыцця, якія падкрэсліваюць выключнае нераўнадушша Васіля Уладзіміравіча да сімпатычных яму калег, увогуле да тых, хто поплеч з ім пачынаў шлях у літаратуру, каму патрэбна было пачуць добрае слова.**

Адзін з такіх творчых пабрацімаў В. Быкава — празаік Пётр Лісіцын. Ён цяпер мала вядомы, застаўся ў свядомасці рэдкіх чытачоў. А між тым, маючы за плячыма багаты жыццёвы досвед, стараўся ў свой час праўдзіва і, наколькі гэта яму ўдавалася, таленавіта расказаць пра сваю вайну, пра многія перыпетыі і складанасці жыцця. А біяграфія ва ўраджэнца Полацка Пятра Лісіцына была зусім не пісьменніцкая. Нарадзіўся ў 1927 годзе. У час вайны партызаніў. Узнагароджаны ордэнам Леніна. У 1944—1953 гг. — на службе ў міністэрстве дзяржбяспекі Латвійскай ССР. Пасля — на службе ў МУС ажно да 1974 года.

Друкавацца Лісіцын пачаў у 1962 годзе на старонках газеты Прыбалтыйскай ваеннай акругі «За Родину». 4 лістапада 1968 года Васіль Уладзіміравіч звяртаецца ў рэдакцыю часопіса «Нёман» (пісаў Лісіцын па-руску) з лістом, адрасаваным намесніку галоўнага рэдактара Георгію Папову (цытуем ліст на мове арыгінала): *«Дорогой Георгий! Я послал в Ваш журнал два рассказа П. Лисицына, нашего автора, человека очень способного и уважаемого. (Он — бывший партизан. В 15 лет награжденный орденом Ленина). Посмотрите там. Возможно, что-нибудь неплохо будет напечатать. Желаю успехов, поздравляю с Великим Октябрем. Ваш В.Быков»*.

Кароткі і сціплы ліст. Нясложны для Васіля Уладзіміравіча час. Галава кругам ідзе ад сваіх клопатаў і сваіх творчых «балячак». У «Звяздзе» толькі што — 28 верасня — надрукавана рэцэнзія І. Агеева «Праклятая вышыня...» «Прапашчая рота...» Прыкры твор». У маскоўскіх выданнях у верасні і кастрычніку друкуюцца рэцэнзіі з назвамі і сёння зразумелымі — «Еще раз о повести «Атака с ходу» і «Странная



Пётр Лісіцын.

история о странной роте»... І ўсё ж Васіль Уладзіміравіч знаходзіць час, чытае творы калегі, стараецца паспрыяць іх выхаду ў свет. На аўтографе ліста рукою Георгія Папова пазначана: *«Что-то было напечатано (из рассказов). А может, и повесть — «Февральский пост», кажется... Г.П.»*.

Сёння ў бібліятэках можна знайсці такія кнігі Пятра Лісіцына, як «Февральский пост» (1978), «Росные травы» (1981)... І аснову той дарозе Пятра Лісіцына ў значнай ступені заклаў Васіль Уладзіміравіч Быкаў.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**

■

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 4 (33)



## У «Плацдарма» — Гран-пры

На працягу ўсёй сваёй гісторыі найстарэйшая беларуская газета заўсёды ішла побач з абаронцамі Айчыны. Сімвалічна, што 23 лютага 2011 года ў межах сумеснага супрацоўніцтва рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны на старонках выдання пачаў друкавацца рэгулярны спецвыпуск «Плацдарм».

За непрацяглы час, які існуе ўкладка, яна не раз была адзначана на самым высокім узроўні. Літаральна на днях на галоўным конкурсе сярод друкаваных СМІ менавіта за спецвыпуск «Плацдарм» газета «Звязда» атрымала Гран-пры конкурсу «Залатая Ліцера». Галоўная ўзнагарода была прысуджана выданню ў намінацыі «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў». А крыху раней, у лютым 2014 года, на штогадовым творчым конкурсе на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі, патрыятычнага выхавання насельніцтва праект рэдакцыі выдання і Міністэрства абароны «Плацдарм» быў прызнаны лепшым у намінацыі «Спецыяльны праект».

«Плацдарм» працягвае выходзіць на старонках «Звязды». Сёння чытачам прапануюцца іншыя публікацыі, але на тую ж тэму — ваенна-патрыятычную.

■ Тонкасці прафесіі

# ВАРТАВЫЯ ПАВЕТРАНЫХ МЕЖАЎ



Памочнік аператыўнага дзяжурнага лейтэнант Максім МОНІЧ праводзіць кантроль функцыянавання апарата.

**Штодзень на баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне ва Узброеных Сілах Беларусі заступае больш за 500 ваеннаслужачых і асоб грамадзянскага персаналу. Асабовы склад дзяжурных змен кожны дзень суправаджае звыш 400 паветраных судоў. На шчасце, сённяшнім вайскоўцам не прыходзіцца страляць на паражэнне. Аднак яны кожную хвіліну трымаюць руку на пульсе.**

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў адным з падраздзяленняў Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны

КАБ пабачыць усё на свае вочы, карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў Фаніпаль — у 15-ю зенітную ракетную брыгаду Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання. Разам са спецыялістамі Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны «заступілі» на баявое дзяжурства і даведаліся шмат чаго цікавага.

Працоўны дзень дзяжурнай змены пачынаецца ў 7.30 раніцы. Медыцынскі агляд, псіхалагічная гутарка — і ўрачыстае пастраенне на рытуальнай пляцоўцы з падняццем Дзяржаўнага сцяга і выкананнем гімна. Загад заступіць на абарону паветраных межаў рэспублікі — і спецыялісты накіроўваюцца на камандны пункт. На працягу гадзіны адбываецца кантроль усіх сістэм, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні, праверка дакументацыі. Ваеннаслужачым даводзяцца асаблівасці будучага дзяжурства. І толькі пасля гэтага новы разлік пачынае баявое дзяжурства.

Пасля на камандным пункце застаецца дзяжурная змена — мінімальная колькасць людзей, гатовых у любы момант уключыць тэхніку і падрыхтаваць яе да прыбыцця асноўнага разліку. Затым мяняюцца. І так на працягу сутак.

У кожнага з іх свае задачы. Памочнік аператыўнага дзяжурнага, у асноўным, працуе па спраўнасці, своечасовым уключэнні аўтаматызаваных сістэм упраўлення. Планшэтысты наносяць на спецыяльныя карты паветраную абстаноўку, якую ім дакладваюць з розных радыётэхнічных падраздзяленняў. Дзяжурны па сувязі, адпаведна, кантралюе спраўнасць каналаў сувязі. Аператыўны дзяжурны адказвае за ўсё. Сёння ім з'яўляецца маёр Андрэй Міхнёнак.

— Самая галоўная задача, на якую працуюць усе, — хуткае і дакладнае давядзенне сігналаў і камандаў міністра абароны, начальніка генеральнага штаба на прывядзенне вайсковай часці ў больш высокія ступені баявой гатоўнасці, — расказвае Андрэй Міхнёнак. — Тады ўключаюцца дывізіёны, якія сваімі сродкамі разведкі працуюць па выяўленні паветраных судоў.

Назіраць за паветранай прасторай не ўваходзіць у абавязкі зенітных ракетных войскаў. Пастаянна за паветранай прасторай сочаць радыётэхнічныя войскі. На шчасце, сучасныя радыёлакацыйныя станцыі «заўважаюць» усе цэлі на тэрыторыі краіны, якія рухаюцца ва ўсіх дыяпазонах вышынь і хуткасцяў.

Аднак, як той казаў, давярай, але правярай. Сучасная тэхніка хоць і надзейны сродак назірання за паветранай прасторай краіны, аднак падстрахавацца не перашкодзіць. Невыпадкова на кожным падраздзяленні дзяжураць назіральнікі ПВН, якія без усялякіх прыбораў візуальна могуць ацаніць абстаноўку. Як толькі ў паветры заўважаюць пэўны лятальны апарат, адразу паведамляюць аб гэтым на камандны пункт.

— Шум рухавіка вінтавога самалёта, — далажыў па гучнай сувязі назіральнік ПВН.

Маёр Міхнёнак прымае інфармацыю, аб чым паведамляе на камандны пункт Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання.

— Верталёт ідзе па заяўцы згодна з планавым палётам, — адказваюць яму.

Супакоіліся. Калі не па заяўцы, у паветра ўздымаецца верталёт і прымушае аб'ект да пасадкі. У выпадку супраціўлення сюды паступае каманда — перайсці ў баявую гатоўнасць № 1, што азначае падрыхтавацца да адкрыцця агню.

— На шчасце, такіх выпадкаў у Беларусі не было, — расказвае **начальнік штаба, першы намеснік камандзіра брыгады палкоўнік Алег ВОЙЧАНКА.** — Напэўна, таму, што дзяжураць высокакваліфікаваныя спецыялісты. А на ўзбраенні — толькі сучасная тэхніка: зенітныя ракетныя сістэмы «С-300». Дзякуючы комплексным сістэмам аўтаматызацыі «Паляна-РБ», мы маем магчымасць бачыць усю абстаноўку з дывізіёнаў і кіраваць імі, а таксама атрымліваць інфармацыю ад радыётэхнічных войскаў, ад авіяцыі.

Дзень праходзіць так, што ні на хвіліну не адлучышся. А яшчэ няма падрыхтоўкі да параду! У перадсвяточныя дні на камандны пункт паступае да 380 дакладаў аб паветранай абстаноўцы.

Для Андрэя Міхнёнка гэта звычайныя працоўныя дні. Праўда, нагрузка большая. Толькі справіцца з ёй вопытнаму спецыялісту нескладана. У брыгадзе ён з 2003 года: на малую радзіму, у Фаніпаль, трапіў адразу пасля заканчэння Ваеннай акадэміі Беларусі. Выпускнік факультэта ракетных войскаў і артылерыі тут праходзіў службу на розных вайсковых пасадах: пачынаючы ад камандзіра ўзвода варты каманднага пункта брыгады да аператыўнага дзяжурнага. Атрымліваецца, што за гэты час засвоіў зусім іншую прафесію.

— Першапачаткова было складана: новыя тэрміны, паняцці, — прызнаецца маёр Міхнёнак. — Трэба было зразумець і ўсе тонкасці гэтай прафесіі: хутка рэагаваць на змяненне абстаноўкі, валодаць максімальнай сканцэнтраванасцю, адначасова ўмець рабіць некалькі спраў. Дапамагалі больш вопытныя калегі.

Сёння ўжо ў яго вучацца многія вайскоўцы. І днём і ноччу на камандным пункце нясуць баявое дзяжурства каля 20 чалавек: афіцэры, прапаршчыкі, кантрактнікі, вайскоўцы тэрміновай службы. Служаць тут і грамадзянскія спецыялісты. Спачатку яны, як і прадстаўнікі новага папаўнення, праходзяць навучанне. І толькі пасля паспяховай здачы іспытаў дапускаюцца да нясення баявога дзяжурства.

— Для таго, каб выконваць свае абавязкі, ваеннаслужачыя нашага падраздзялення ў першую чаргу павінны быць высокаадукаванымі, — удакладняе начальнік штаба. — Не малое значэнне мае і іх здароўе, маральна-псіхалагічны стан. Астатнія патрабаванні да супрацоўнікаў залежаць ад таго, якую пасаду яны будуць займаць. У нас вельмі шырокае кола спецыяльнасцяў, больш за 50. Калі сюды прыходзяць людзі, ажыццяўляецца размеркаванне ў залежнасці ад узроўню фізічнай падрыхтоўкі і інтэлектуальных асаблівасцяў.

Нясуць баявое дзяжурства ў зенітнай ракетнай брыгадзе і жанчыны. Гэтым ужо нікога не здзівіш. Толькі ўсё роўна цікава, што прываблівае іх у мужчынскай прафесіі? Асабліва, калі яны прыгожыя дзяўчаты, якім крыху больш за 20.

— Я з тых людзей, якія не могуць сядзець на адным месцы, — кажа Юлія Палітаева. — Пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа тую працу, якая б мяне задаволіла, знайсці было цяжка. Знаёмыя падказалі, што можна ўладкавацца ў брыгаду. Вырашыла паспрабаваць, аб чым ні разу не пашкадавала.

Нагрузка дзяўчыну не засмучае: аргументуе тым, што мае добрае здароўе. Галоўнае, як яна прызнаецца, у сям'і яе выбар падтрымліваюць. Вайскоўцам быў толькі дзядзька, неўзабаве ў армію пойдзе родны брат.

Пакуль размаўлялі, прыйшоў час ехаць на адзін з дывізіёнаў брыгады — туды, дзе ў любы час спецыялісты гатовы прывесці тэхніку ў гатоўнасць № 1. Тут працуюць сапраўдныя прафесіяналы! Кіраваць «С-300» у выпадковага вайскоўца наўрад ці атрымаецца. Таму тут выпадковых не бывае.

Начальнік разліку аддзялення баявога кіравання старшы лейтэнант Яўген Галузаў прызнаецца, што ўсе тыя веды, якія атрымаў у Ваеннай акадэміі, спатрэбіліся на практыцы. Сёння ў яго падпарадкаванні знаходзяцца 8 салдат тэрміновай службы. Адслужыўшы толькі два гады, паспеў прайсці атэстацыйную камісію: зараз чакае загаду на прызначэнне яго на пасаду начальніка аддзялення.

— Прафесія спецыяліста Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны — адна з найбольш перспектыўных у вайсковай сферы, — упэўнены Яўген Галузаў. — Цікавая праца, створаны ўсе ўмовы, магчымасці кар'ернага росту. Аднак, калі не любіш справу, якой займаешся, усё — пустое. Толькі гэта не пра мяне. Яшчэ калі вучыўся ў Ваеннай акадэміі, быўшы на розных вучэннях, адчуў, што я ў «сваёй талерцы». Сёння пераконваюся ў гэтым кожны дзень, калі прыступаю да баявога дзяжурства. Адчуваю ў гэты час, што і я ў тым ліку ў адказе за паветраную бяспеку краіны.

...А мы тым часам пакідаем 15-ю зенітную ракетную брыгаду. На душы — задавальненне ад недарэмна праведзенага дня і спакой за мірнае неба над нашай Беларуссю.

**Вераніка КАНЮТА. Фота Надзеі БУЖАН.**

*Мінскі раён*

Аператыўны дзяжурны Андрэй МІХНЁНАК дакладвае абстаноўку на камандны пункт паўночна-заходняга аператыўна-тактычнага камандавання.

■ Творчы падыход

# НА ВАСТРЫІ ВАЙСКОВАГА ЖЫЦЦЯ...

## Студыя ваенных пісьменнікаў за дзесяцігоддзі існавання можа пахваліцца цікавымі праектамі і творамі

**На днях студыя ваенных пісьменнікаў адзначыла 10-годдзе з дня ўтварэння. Для гісторыі прамежак, вядома, невялікі, але і за гэты час зроблена нямала. Выдадзена 2 літаратурныя зборнікі, напісаны дзясяткі твораў, адбылося больш як 150 творчых сустрэч літаратараў з вайскоўцамі.**



Намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Алесь БАДАК падарыў студыі ваенных пісьменнікаў кнігу Мікалая Смірнова «Генерал Корж».

— Сімвалічна, што гэты юбілей мы адзначаем у гадавіну вельмі яркіх памятных дат, — зазначыў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 75-годдзе далучэння Заходняй Беларусі да БССР, што азначала аб'яднанне беларускага народа ў адзіную дзяржаву. Безумоўна, адной з найважнейшых гістарычных дат, якая назаўсёды ўвайшла ў гісторыю, з'яўляецца 20-годдзе выбару беларускім народам першага Прэзідэнта. Сімвалічна і тое, што студыя ваенных пісьменнікаў была створана літаральна праз месяц пасля таго, як утварыліся органы ідэалагічнай работы Узброеных Сіл. А сёння ў сферы ідэалогіі разгортваецца галоўная бітва за свядомасць людзей. Таму смела можна сказаць, што ў наш час літаратура і мастацтва ў большай ступені, чым у мінулым, з'яўляюцца фактарамі забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

З 2008 года пры непасрэдным удзеле членаў студыі падрыхтавана і выйшла 9 літаратурна-мастацкіх дадаткаў да часопіса «Армія» Міністэрства абароны — «Армія і культура». У год выходзіць два нумары, дзе публікуюцца вершы, нарысы, урыўкі з новых твораў пісьменнікаў.

Немалая заслуга членаў студыі і ў пытаннях прапаганды гераіка-патрыятычнай спадчыны пісьменнікаў старэйшага пакалення, папулярызацыі твораў беларускіх пісьменнікаў, прыцягнення да творчай дзейнасці маладых аўтараў.

— У студыю ўваходзяць крыху больш за 40 пісьменнікаў, — расказаў **кіраўнік студыі ваенных пісьменнікаў Яўген КАРШУКОЎ.** — Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Алесь Савіцкі і Мікалай Іваноў, ветэраны Узброеных Сіл, людзі, якім неабыякавая ваенна-патрыятычная тэма. Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў членамі студыі рыхтуецца зборнік, куды ўвойдуць як ужо вядомыя творы, так і тыя, якія напісаны параўнальна нядаўна.

Акрамя гэтага, Яўген Каршукоў з'яўляецца кіраўніком самага старэйшага ў Беларусі літаратурнага аб'яднання «Доблесць», якое адразу пасля вайны было заснавана пісьменнікамі-франтавікамі. Некаторыя з іх і сёння складаюць асноўны актыў студыі.

— Вельмі мудры крок кіраўніцтва беларускай арміі і кіраўніцтва дзяржавы, якія стварылі гэтую студыю, тым самым даручыўшы нам прапаганду мастацкага слова, культуры і лепшых дасягненняў Беларусі сярод вайскоўцаў, — перакананы **лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь пісьменнік Алесь САВІЦКІ.** — І мы жывём у такі час, калі кожны дзень пацвярджае правільнасць гэтага кроку. І гэта важна, каб пісьменнік сёння быў на вастрыі салдацкага жыцця. Каб вайсковец адчуваў, што за яго плячыма не проста кавалак зямлі, а яго Радзіма, дом яго і братоў, былая слава бацькоў, якую трэба берагчы. Пісьменнікі Беларусі паказалі выдатныя ўзоры таго, як трэба сёння займаць гэтую пазіцыю. І жыццё пацвердзіла, што будучыню народа, будучыню краіны, будзе вырашаць не ядзерная, а інтэлектуальная энергія. Той народ, тая нацыя, якая назапасіць гэтай энергіі больш, пераможа ў будучых сутыкненнях.

**Вераніка КАНЮТА. Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ**

Генерал-маёр Аляксандр ГУРА ўручае дыплом Міністэрства абароны кіраўніку студыі ваенных пісьменнікаў Яўгену КАРШУКОВУ.

■ Нельга забыць

# ЛЯСНЫЯ ПОМНІКІ ЖЫВУЦЬ

## Іх даглядаюць жыхары вёсак і мясцовая ўлада

1944-2014 70 гадоў вызвалення

**З пачаткам вясны ўсюды пачынаецца актыўная прыборка тэрыторыі. Прыводзяцца ў парадак і тэрыторыі вакол помнікаў, якія знаходзяцца ў населеных пунктах. Але ў нас нямала памятных знакаў ахвярам вайны, устаноўленых даволі далёка ад гарадоў і вёсак. Многія знаходзяцца ў глыбіні лясоў, там, дзе праводзіліся масавыя расстрэлы або загінулі людзі. Сённяшняя размова — менавіта пра такія помнікі.**

### Крыжы, якія падаюць

У Белавежскай пушчы, у самай глыбіні векавога лесу, стаіць унікальны помнік ахвярам фашызму. Называецца ён «Крыжы, якія падаюць». Першы раз мне давялося наведаць помнік зімой. На фоне белага снегу нахіленыя крыжы глядзяцца вельмі незвычайна. З розных бакоў вялізныя бетонныя стэлы выглядаюць зусім парознаму. Калі глядзець прама, яны падобны да слупоў і перакладзін, ступіш крок управа або ўлева — здаецца, манумент нахілены ўперад, а глянеш на яго збоку — сапраўды, крыжы восьвось упадуць на зямлю.

Крыху воддаль за крыжамі да гэтай пары прыкметны равок, у якім знайшлі спачын больш за сто расстраляных вяскоўцаў. Іх закатавалі ў першыя дні жніўня 1941 года. У іншых рэгіёнах фашысты пачалі лютаваць пазней, калі адчулі супраціўленне насельніцтва, прысутнасць партызанаў. А тут толькі прыйшлі — пачалі забіраць мясцовых актывістаў, а разам з імі часта і тых, хто пад руку трапіць. Людзей зганялі ў лес некалькі дзён, а з лесу яны ўжо не вярнуліся.

Аказваецца, у гэтай магіле ляжаць жыхары вёскі Белавежа, а таксама суседніх паселішчаў, якія пасля вайны сталі тэрыторыяй Польшчы, а брацкая магіла жыхароў вёскі Чадзель Пружанскага раёна цяпер знаходзіцца ў Польшчы. Такія вось зігзагі гісторыі... Раней, калі памежны рэжым быў бязвізавым, з абодвух бакоў раз на год ладзіліся памінальныя мерапрыемствы. Да родных магіл хадзіла шмат людзей з адной і другой дзяржаў. Цяпер працэдура стала больш складанай, і мерапрыемствы праходзяць больш сціпла. Але праходзяць. Вось і сёлета 2 жніўня ў Пружанскім раёне ля крыжоў збяруцца людзі.

— Да гэтай пары помнік будзе грунтоўна адрамантаваны, — паабяцаў **намеснік старшыні Пружанскага райвыканкама Мікалай КУДРАВЕЦ.** — Бо з 1980 года, калі яго ўзвялі пружанскія будаўнікі па праекце польскіх архітэктараў, манумент перажываў толькі бягучыя рамонты.

Ляснічы Нікарскага лясніцтва Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Аляксандр ПЕКАЧ расказаў, што бетон пачаў у многіх месцах разбурацца, рамонт патрабуецца тэрмінова. Парадак на прылеглай тэрыторыі падтрымліваюць леснікі. І на гэты раз напярэдадні Дня Перамогі тут усё пачысцілі, прыбралі, заўважыў Аляксандр Міхайлавіч. Не забыліся і пра суседні сціплы абеліск двум загінулым партызанам, які стаіць на тэрыторыі лясніцтва. Яго пабялілі, прывялі ў парадак наваколле.

«Крыжы» па традыцыі даглядаюць супрацоўнікі лясніцтва, бо ўезд на тэрыторыю пушчы мае асаблівы рэжым. З боку вёскі Белы Лясок прапускаецца толькі спецыяльны і службовы аўтатранспарт. А вось удзельнікі веласіпедных экскурсій цяпер могуць наведаць і гэты помнік.

### Шэсць ствалоў — як шэсць душ

Помнік у Шчэбрынскім лесе незвычайны тым, што побач са сціплым абеліскам, які стаіць на месцы расстрэлу дзвюх сем'яў вырас граб з шасцю стваламі. Выходзіць, сама прырода ўвекавечыла памяць бязвінна загубленых.

Гэта зусім недалёка ад Брэста, паміж вёскамі Радванічы і Франапаль, пры Польшчы тут знаходзілася сядзіба мясцовага ляснічага Івана Гаўрылюка. Пра тое, што былы ляснічы з першых дзён вайны дапамагаў партызанам, месцічы даведаліся толькі пасля таго, як яго, жонку і малога сына па-зверску

Абеліск ля вёскі Лескі Камянецкага раёна.

забілі — пра гэта і расказвае шыльда з тыльнага боку помніка. А цэнтральная шыльда змяшчае звычайны абстрактны тэкст: «Бясстрашным і мужным воінам і партызанам». Тое, што лістападаўскім днём 1942 года была закатавана таксама сям'я Пятра Фёдаравіча Белавежы, мясцовым краязнаўцам стала вядома пазней. Пятра Белавежу, як і Івана Гаўрылюка, забілі з жонкай і сынам. Іх дзеці былі амаль равеснікі — хлопчыкі 10-11 гадоў.

У 1970-я гады тут паставілі сціплы абеліск. Раней сюды вяла даволі шырокая дарога, нават раённыя мерапрыемствы праводзіліся, прымеркаваныя да памятных дат. Але мяняюцца пакаленні, дарога паступова робіцца больш вузкай і непрыкметнай. А граб тым часам становіцца вышэйшым. Хутчэй за ўсё, у адно сышліся некалькі дрэў, якія потым шчыльна зрасліся камлямі. І кожны ствол, нібы нага, абапіраецца на зямлю. А далей, угары, дрэвы трохі разыходзяцца адно ад аднаго і завяршаюцца вялізнай раскошнай шапкай зялёнай лістоты, якая толькі распусцілася.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

■ З рэдакцыйнай пошты

# «ВІДАЦЬ, БОГ МЯНЕ ЗБЯРОГ»

Марыя Антонаўна Цык (у дзявоцтве Касцюкевіч) — ветэран Вялікай Айчыннай вайны і працы, жыхарка фабрычнага пасёлка мэбельшчыкаў Чырвоны Пільшчык Ельскага раёна (з чэрвеня 2010 года пражывае ў г.п. Лоеў Гомельскай вобласці, у сям'і дачкі Галіны). Нягледзячы на старыя гады, яна маладая душой, дапытлівая, мае бліскучы розум і фенаменальную памяць, з'яўляецца аўтаркай шматлікіх гумарэсак і газетных артыкулаў, актыўнай удзельніцай ветэранскіх мерапрыемстваў.

У пачатку чэрвеня 1943 года Марыя і яе старэйшая сястра Ганна Касцюкевіч, якая працавала да вайны настаўніцай, добраахвотна ўступілі ў Ельскі партызанскі атрад — з ліпеня 1943 года партызанскі атрад імя Чапаева 37-ай Ельскай партызанскай брыгады. У 20-х чыслах жніўня таго ж года Марыя ў лесе нарвалася на варожую засаду, была схоплена і дастаўлена немцамі ў вёску Забалоцце, што за дваццаць кіламетраў ад Ельска. Вёска была спалена і бязлюдная (у чэрвені 1943 года падчас карнай акцыі і ў Забалоцці было спалена амаль усё насельніцтва — 167 мірных жыхароў!). Ні дакументаў, ні зброі, ні іншых доказаў, якія ўказвалі б на прыналежнасць да партызанаў, у затрыманай не аказалася. З'явілася надзея на вызваленне. Ды дзе там — аб'явіўся здраднік-паліцай, які пазнаў Марыю. Ён ведаў, што яна пайшла да партызанаў і не прапусціў выпадку выслужыцца перад сваімі гаспадарамі: Марыю змясцілі пад варту ў адзін з 3-х дамоў, што цудам уцалелі. Пачаліся допыты, якія праводзілі два нямецкія афіцэры-эсэсаўцы. Але Марыя не назвала нікога і нічога не выдала, а строга прытрымлівалася сваёй версіі, нават пасля жорсткіх катаванняў: «Лепш смерць, чым здрадніцтва», — лічыла яна.

«Два нямецкія салдаты, якія знаходзіліся ў доме, пачалі мяне жорстка збіваць бярозавымі палкамі, а калі я страчвала прытомнасць, мяне адлівалі халоднай вадой і працягвалі далей сваю чорную справу, — успамінае Марыя Антонаўна. — Ад гэтых нечалавечых катаванняў і болю я хутка страчвала прытомнасць. Ачуняла ў іншым пакоі на глінянай падлозе. Некалькі дзён на жываце я правалялася ў гэтым пакоі з распухлымі нагамі, бо хадзіць пасля такіх катаванняў не магла. У тыя дні мне споўнілася 18 гадоў.

Праз некалькі дзён пасля майго затрымання, эсэсаўцы пагрузілі мяне на калёсы і пад аховай аўтаматчыка адвезлі ў Мазыр, дзе змясцілі ў дом да адзінокай жанчыны па імені Сабіна. Гаспадыня дома прыйшла ў жах, убачыўшы мяне такой збітай, але размаўляць са мной не магла, таму што побач знаходзіўся нямецкі салдат з аўтаматам. Яна моўчкі дапамагла мне памыцца і пераапрануцца ў яе чыстае адзенне. Будучы ў прыгнечаным стане, я ўсё ж здзіўлялася і не разумела прычыны, чаму немцы не расстралялі мяне, як многіх цывільных асоб, затрыманых у лясах».

У пачатку верасня 1943 года Марыя была адпраўлена ў таварным вагоне цягніка ў Германію (ці то ў рабства, ці то ў канцлагер), з якога з дапамогай славацкага чыгуначніка Дэзіндэра Страка ўцякла на станцыі Вайноры, што ў раёне сталіцы Славакіі. Нейкі час Марыя пражывала нелегальна ў сям'і славацкіх патрыётаў Гранчаравых у вёсцы Берэксек, якія прынялі яе як родную дачку, хоць мелі сваіх семярых дзяцей. Пасля пры садзейнічанні ўсё таго ж Дэзіндэра Страка змагла зарэгістравацца і атрымаць пашпарт у нямецкай жандармерыі на выдуманае прозвішча Гулеева.

З красавіка 1944 года Марыя Касцюкевіч, яна ж Гулеева, зноў у партызанскім атрадзе, толькі на гэты раз у славацкім, пад назвай «Павел», камандзірам якога быў славак Альбін Грознар, а ў пачатку снежня таго ж года — у савецкім дэсантным атрадзе «Наперад», які складаўся

з 30-ці байцоў пад камандаваннем падпалкоўніка Осіпава (па мянушцы «Марскі»), закінутым у Славакію для вядзення падрыўной работы супраць гітлераўскіх захопнікаў у раёне Банска-Быстрыцы.

З успамінаў Марыі Антонаўны:

«Атрад «Наперад» знаходзіўся высока ў гарах Нізкія Татры ў вёсцы Калішце. Паміж сабой гэту вёсачку мы называлі маленькай Масквой. Камандзір атрада вельмі ўзрадаваўся майму прыходу: у яго атрадзе ніхто не меў славацкага пашпарта і не валодаў славацкай мовай. Так я і стала разведчыцай. Мне часта для выканання разведзаданняў даводзілася выходзіць у нямецкія гарнізоны. Маючы сапраўдны пашпарт і добра ведаючы мову, немцы мяне не затрымлівалі. Неаднойчы даводзілася ўдзельнічаць у баявых аперацыях са зброяй у руках, нават з хлопцамі браць «языка».

Усярэдзіне сакавіка 1945 года наш атрад злучыўся з войскамі Чырвонай Арміі, і ў хуткім часе ўвесь яго асабовы склад атрымаў водпуск з паездкай на Радзіму. Дзень Перамогі мы ўсе разам сустракалі ў Кіеве, дзе быў штаб атрада і куды мы прыехалі на адпачынак».

...А вось пра тое, чаму мяне не расстралялі ў час допытаў і катаванняў у Забалоцці, я даведалася ў 1950 годзе ад знаёмай жанчыны, якая прыязджала да маёй мамы з Мазыра, з якой да вайны яны разам працавалі на Мазырскім лесапільным заводзе «Пралетарый». Маміна знаёмая пазнала мяне. Аказваецца, у 1943 годзе, калі я знаходзілася ў Мазыры ў доме Сабіны пад аховай нямецкіх аўтаматчыкаў, яна прыходзіла да гаспадыні і яшчэ пыталася ў яе, чаму мяне каравуляць нямецкія салдаты. Нямецкі афіцэр Тыль, які пражываў у той час у гэтым жа доме і дапытваў з Шульцам мяне ў Забалоцці, расказваў Сабіне, а яна пасля гэтай жанчыне, наступнае: «Мы ў лесе злавілі дзяўчыну-партызанку, амаль дзіця. Ну якая з яе ваяка? Пры ёй нават зброі не было. І ў мяне не павярнуўся язык аддаць загад аб яе расстрэле. У мяне ж дома ёсць дачка яе гадоў. Праўда, Шульц упіраўся, але я яго «ўламаў».

Мне і цяпер цяжка паверыць, што не ўсе немцы былі звярамі. Як відаць, Бог мяне збярог».

З ліста былой жыхаркі станцыі Славечна Ельскага раёна, партызанскага атрада імя Чапаева 37-ай Ельскай партызанскай брыгады, вязніцы Оўруцкай фашысцкай турмы (Украіна) Марыі Цалко і з яе аповедаў пры сустрэчы, Марыя Антонаўна даведалася пра абставіны паланення, знаходжання ў фашысцкіх засценках Оўруцкай турмы і расстрэлу яе роднай сястры Ганны Касцюкевіч, 1917 года нараджэння. Невядома было Марыі, што трохі пазней таго, як яна нарвалася на варожую засаду, партызанскі атрад імя Чапаева, у складзе якога працягвала барацьбу з акупантамі яе сястра Ганна, пры сутыкненні з немцамі падвергся наземнаму і паветранаму нападу. Партызаны, адстрэльваючыся, з боем адыходзілі ўглыб лесу. Уцякаючы ад праследнікаў, аказаліся разам спачатку Ганна Касцюкевіч і Марыя Цалко, а пасля і славак Янэк Глач.

З-за беспаспяховага пошуку акуляраў, згубленых Ганнай на бягу, і моцнага пашкоджання Марыяй правай нагі (з разбегу наляцела на пянёк), «сябры па няшчасці» згубілі атрад. Усю ноч з вечара да раніцы блукалі па балоце: сухія месцы былі заняты салдатамі ворага. Раніцай ім сустрэліся мужчына і жанчына са спаленай фашыстамі суседняй вёскі. Мужчына прапанаваў Янэку разам прадоўжыць пошук партызанаў, а жанчына папрасіла Ганну схадзіць з ёю ў яе вёску па гародніну: усім вельмі хацелася есці. Марыі з разбітай нагой загадана было заставацца на месцы і чакаць іх вяртання. Але ажыццявіць задуманае ім не ўдалося. Яны былі схоплены немцамі, якія прачэсвалі лес са службова-пошукавымі аўчаркамі. Сабака, які знайшоў Марыю, учапіўся ёй у галаву, сарваў хустку і пакусаў. На наступны дзень іх разам з іншымі людзьмі, злоўленымі ў лесе, пасадзілі ў кузавы грузавых машын і адвезлі ў Оўруцкую турму.

На допыце Ганна сказала немцам, што ў лесе была толькі адзін дзень і пра партызанаў нічога не ведае. Ёй быццам бы паверылі: не білі. Назаўтра паліцаі да Ганны ў камеру ўпіхнулі дзяўчыну змардаванага выгляду па імені Воля, якая прадставілася настаўніцай, якую абвінавачваюць у сувязях з партызанамі, і Ганна ёй, як на духу, усё расказала пра сябе. Пасля гэтай размовы Волю вывелі паліцаі, а Ганну немцы сталі біць і называць на допытах бандыткай. Ганна зразумела, што зрабіла непапраўную, ракавую памылку, даверыўшы сваё патаемнае завербаванай немцамі незнаёмцы.

Кожную ноч а 4 гадзіне раніцы з засценкаў Оўруцкай турмы вывозілі вязняў на расстрэл. Усе палонныя жылі ў пастаяннай напрузе, трывожна чакаючы сваёй чаргі.

Аднойчы, бліжэй да вечара ў турме забегалі немцы і іх «бобікі»-паліцаі — прайшла чутка, што войскі Чырвонай Арміі недалёка адсюль разграмілі нямецкі гарнізон. Да турмы спешна былі пададзены дзве грузавыя машыны, куды пасадзілі вязняў, у тым ліку і Ганну Касцюкевіч, і адвезлі да месца масавага расстрэлу.

Пасля вайны, да чэрвеня 1947 года, Марыя Цык жыла ў Ленінградзе, пасля вярнулася на сваю малую радзіму, у пасёлак Чырвоны Пільшчык. Працавала бухгалтарам у леспрамкаапарцелі «Чырвоны Пільшчык», а пасля пераўтварэння арцелі ў Ельскую мэблевую фабрыку — інжынерам па нармаванні і аплаце працы і, па сумяшчальніцтве, музычным работнікам у дзіцячым садку. З мужам выраслілі дваіх дзяцей — сына і дачку. Цяпер у жанчыны сямёра ўнукаў і трое праўнукаў. У іх яна душы не чуе. І любоў гэта ўзаемная.

**Уладзімір ЖУРАЎСКІ,** *г. Мазыр*

■

# ЛЯСНЫЯ ПОМНІКІ ЖЫВУЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Побач з дрэвамі помнік, вядома, хутчэй пакрываецца мохам, яму патрэбен пастаянны догляд. Гэтым займаецца Радваніцкі сельвыканкам. **Кіраўнік справамі Таццяна КАВАЛЕВІЧ** сказала, што нядаўна вакол помніка паставілі новую бетонную агароджу, падфарбавалі, прыбралі навокал. Па прыборцы тэрыторыі дапамагаюць вучні Радваніцкай школы. Але леташняй восенню наймалі яшчэ двух рабочых для дробных будаўнічых работ.

— Усяго ж на тэрыторыі сельсавета 13 помнікаў ахвярам вайны, 8 з іх знаходзяцца ў лясах і палях, — расказала Таццяна Якаўлеўна. Штогод кожную вясну да кожнага з 13 памятных знакаў выязджае камісія сельсавета, вызначаецца, якую работу па добраўпарадкаванні трэба правесці. Дапамагаюць школы, прадпрыемствы, арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі адміністратыўнай адзінкі.

«Крыжы» ў Пружанскім раёне.

## У ПАМЯЦЬ ТРАГЕДЫІ ЛЕСАК

Лескі ў Камянецкім раёне — адна з «вогненных» вёсак Беларусі. Яе лёс у многім вызначыла месцазнаходжанне. Лескі згубіліся ў глыбіні векавога лесу, удалечыні ад значных дарог. Карнікі лічылі такія населеныя пункты патэнцыяльна небяспечнымі, магчымымі ачагамі партызанскага руху. Таму 4 мая 1943 года ўсіх жыхароў сагналі на край сяла, на ўзлесак, і расстралялі. Хаты спалілі. Выратавацца ўдалося адной маленькай дзяўчынцы. Паліцай, знаёмы ці родзіч яе бацькоў, схаваў дзіця на возе з сенам, а потым вывез.

На помніку, узведзеным у 80-я гады, высечаны прозвішчы бязвінных ахвяр, цэлых сем'яў па пяць, восем, дванаццаць чалавек. Усе пакаленні: прабабулі, бабулі, маці, дзеці-немаўляты... Жудасна гэта чытаць. Цяпер у гадавіну трагедыі тут збіраюцца вяскоўцы, прыязджаюць нават далёкія сваякі загінулых.

Летась, у снежні, гэты помнік паказаў мне **старшыня Камянецкага райвыканкама Андрэй ПІСАРЫК.** Хоць знешне абеліск выглядаў дагледжаным, Андрэй Мікалаевіч сказаў, што хутка яго чакае капітальны рамонт.

**Метадыст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі райвыканкама Ірына РЭЗНІЧУК** паведаміла, што рамонт помніка ў Лесках падыходзіць да завяршэння. З раённага бюджэту выдаткавана каля ста мільёнаў рублёў. Найперш спілавалі старыя дрэвы, вільгаць з якіх трапляла на абеліск і спрыяла яго разбурэнню. Сам помнік атынкаваны і пафарбаваны. Вакол пакладзена новая плітка, зроблены дарожкі. З двух бакоў ад яго будуць устаноўлены лаўкі, каб людзі маглі адпачыць. Лескі пасля вайны адрадзіліся. Праўда, цяпер пастаянных жыхароў засталося мала, але ўлетку вёска ажывае. Жыхары Лесак і іх дзеці прымаюць удзел у доглядзе помніка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Супрацоўніцтва

# САПЁРАМ — У ДАПАМОГУ

## Абсталяванне з Індыі будзе дапамагаць змагацца з «негуманнай» зброяй

**Урачыстая цырымонія перадачы Індыяй бязвыплатнай тэхнічнай дапамогі Міністэрству абароны Беларусі адбылася ў 2-й інжынернай брыгадзе. Згодна з дамоўленасцямі, прадугледжанымі пратаколам V да Канвенцыі аб «негуманнай» зброі, беларускія Узброеныя Сілы атрымалі 90 пераносных радыёстанцый і 30 спадарожнікавых навігацыйных прыёмнікаў агульным коштам больш за 45 тысяч долараў ЗША.**

Дакумент аб перадачы абсталявання, якое будзе выкарыстоўвацца групамі размінiравання для знаходжання боепрыпасаў і выбухованебяспечных прадметаў, падпісалі пасол Індыі ў Беларусі Манодж Кумар Бхарці і начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй Куракоў.

Як адзначыў апошні, для нашай краіны аказаная дапамога мае вялікае значэнне. «Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі было выяўлена і абясшкоджана каля 27 мільёнаў боепрыпасаў, — расказаў Андрэй Куракоў. — Дагэтуль штогод мы знаходзім у зямлі каля 20 тысяч слядоў той вайны. Летась, напрыклад, такіх знаходак было 28 тысяч. Мы прыкладваем усе намаганні для таго, каб засцерагчы нашу тэрыторыю. Атрыманае абсталяванне будзе садзейнічаць хутчэйшаму вырашэнню гэтай праблемы».

— Паміж Індыяй і Беларуссю існуюць плённыя сувязі ў эканамічнай, палітычнай і абарончай сферах, — падкрэсліў пасол Індыі. — Што тычыцца супрацоўніцтва ў абарончай сферы, то наладжаны пэўныя механізмы, штогод праходзяць сустрэчы паміж дэлегацыямі краін, двухбаковыя перамовы. Нас цікавяць беларускія тэхналогіі, магчымасці мадэрнізацыі ваеннай тэхнікі. На ўзбраенні ў Індыі знаходзяцца ўзоры расійскай ваеннай тэхнікі, якія мадэрнізуюцца пры дапамозе беларускага боку. Я магу з упэўненасцю сказаць, што да таго часу, пакуль існуюць узброеныя сілы, супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі будзе працягвацца.

Фота БЕЛТА.

**Вераніка КАНЮТА**

■

■ Калі спяваюць салдаты

# АРМІЯ ФЕСТЫВАЛЬНАЯ

**Уладальнікам галоўнай прэміі конкурсу армейскай песні ўпершыню сталі Сілы спецыяльных аперацый. Перамогу прынесла жанчына!**

XVII тэлевізійны фестываль армейскай песні «Зорка» завяршыўся цырымоніяй узнагароджання і гала-канцэртам яго лаўрэатаў, які адбыўся ў канцэртнай зале «Мінск». Пераможцы штогадовага фестывалю былі вызначаны ў чатырох намінацыях — «Выканаўцы ваенна-патрыятычнай песні», «Аўтары-выканаўцы», «Вакальныя групы і ансамблі», «Выканаўцы армейскай песні».

— За 17 гадоў, што праводзіцца фестываль, ён аб'яднаў вакол сябе каля 30 тысяч удзельнікаў, больш за 300 з якіх сталі лаўрэатамі, — зазначыў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — Гэта вялікая колькасць таленавітых выканаўцаў, творчых калектываў, мастацкае майстэрства якіх, безумоўна, працуе на выхаванне патрыятызму, высокай духоўнасці нашай моладзі. Асабліва гэта адчувалася сёлета, калі мерапрыемства было прысвечана 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Фестываль армейскай песні «Зорка» — адзіны фестываль у краінах СНД, які праводзіцца з поўнай тэлевізійнай версіяй і гала-канцэртам. Гэта сведчыць аб тым, якой высокай ацэнкай адзначана майстэрства выканаўцаў.

У адборачных турах фестывалю сёлета прынялі ўдзел каля 2 тысяч чалавек. Сярод канкурсантаў — вайскоўцы і члены іх сем'яў, сяржанты і салдаты тэрміновай службы, курсанты ваенных навучальных устаноў, суворaўцы, цывільная моладзь. Каля 90% удзельнікаў спрабавалі свае сілы на фестывалі ўпершыню.

Гран-пры заваявала старшы прапаршчык Алена Шклянко, якая прадстаўляла Сілы спецыяльных аперацый. Памочніца начальніка аддзялення ідэалагічнай работы — начальнік клуба 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння да ўзнагароды ішла 20 гадоў: з таго самага часу, калі прыйшла ва Узброеныя Сілы. І гэта нягледзячы на тое, што тэлевізійнаму фестывалю армейскай песні «Зорка» — толькі 17. Раней ён называўся проста — фестываль салдацкай песні. І з самага першага конкурсу, з году ў год, старшы прапаршчык выконвае новыя творы, каб здзівіць журы. За

Прыз глядацкіх сімпатый уручылі навучэнцы гімназіі № 16 г. Мінска Ганне АЛЯКСАНДРАВАЙ.

Гран-пры фестывалю заваявала памочніца начальніка аддзялення ідэалагічнай работы — начальнік клуба 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння старшы прапаршчык Алена ШКЛЯНКО.

гэты час была ўдастоена 3-га месца ў складзе вакальна-інструментальнага ансамбля «Полымя», 3-га месца ў сольным выступленні і, нарэшце, — перамога.

— Ужо хацела звальняцца са службы, а цяпер падумала: «Як жа без мяне мае вайскоўцы?» — прызналася Алена Шклянко. — Сярод іх, між іншым, вельмі шмат таленавітых юнакоў. Вядома, паколькі брыгада мае спецыяльнае прызначэнне, у першую чаргу яны займаюцца баявой падрыхтоўкай. Аднак удзельнічаюць і ў шматлікіх культурных мерапрыемствах.

Сёлета журы фестывалю на чале з народным артыстам Беларусі Ігарам Лучанком былі заснаваны дзве спецыяльныя прэміі — «За ўмацаванне культурных сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і Дэмакратычнай рэспублікай Конга» і «За высокі мастацкі ўзровень выканання песні на беларускай мове». «Касіў Ясь канюшыну» прагучала ў выкананні вакальнай групы слухачоў факультэта па падрыхтоўцы замежных вайскоўцаў Ваеннай акадэміі Беларусі.

Невыпадкова, у адпаведнасці з рашэннем журы, пераходны прыз Міністэрства абароны Беларусі атрымала галоўная кузня ваенных кадраў краіны — Ваенная акадэмія. Традыцыйна быў уручаны прыз глядацкіх сімпатый. На гэты раз гледачоў пакарыла навучэнка мінскай гімназіі № 16 Ганна Аляксандрава, якая выканала песню «Бярозанька». Ганна — лаўрэат шматлікіх конкурсаў, але ў фестывалі армейскай песні ўдзельнічае ўпершыню. Як прызналася дзяўчынка, такім поспехам абавязана сваёй кіраўніцы Святлане Яфімчык.

Як паказвае гісторыя конкурсу, песні беларускай артысткі — бяспройгрышны варыянт. Некалькі гадоў таму яе вучань Канстанцін Лакуцін станавіўся ўладальнікам Гран-пры фестывалю. Сёлета, акрамя Ганны Аляксандравай, за выкананне песні «Хачу служыць» яе навучэнец Андрэй Петрулевіч стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі журы «За прафесіяналізм і арыгінальнасць пастаноўкі канцэртнага нумара».

— У мяне вельмі шмат песень пра Беларусь, — расказала **мастацкі кіраўнік студыі «Сям'я» Святлана ЯФІМЧЫК.** — У тым ліку і на ваенна-патрыятычную тэму. Так склалася, што яна мне вельмі блізкая, бо, у першую чаргу, тычыцца маёй сям'і. Мой дзед прайшоў усю вайну. На шчасце, без ніводнага ранення, хаця быў мінамётчыкам. Таму пра вайну я ведаю не па чутках, аб чым шораз расказваю ў сваёй творчасці.

Паслухаць тую ж «Бярозаньку», а таксама пазнаёміцца з лаўрэатамі конкурсу з'явіцца магчымасць і ва ўсіх ахвотных. Тэлевізійную версію гала-канцэрта фестывалю гледачы змогуць убачыць у эфіры тэлеканала «Беларусь-1». Напярэдадні Дня Перамогі песні патрыётаў стануць добрым падарункам для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

■



■ Нявыдуманая гісторыя

# ЗВЫЧАЙНАЯ СПРАВА САПЁРА-РАЗВЕДЧЫКА

**Першы год у Ленінградскім вучылішчы для беларускага падлетка са слуцкай вёскі Арсенія Люцко праляцеў непрыкметна. Здаўшы іспыты за першы курс, планаваў паехаць летам дадому. Нават узяў чыгуначны білет на 24 чэрвеня! Пасля апошняга экзамену група навучэнцаў адправілася ў экскурсію па горадзе рэвалюцыі. Але ў Летнім садзе ўбачылі вялікі натоўп каля рэпрадуктараў. Раптам з «талеркі» пачулася трывожная мелодыя, і народны камісар замежных спраў СССР В.М. Молатаў аб'явіў: «Сёння ў чатыры гадзіны раніцы фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз»...**

Хлопцы ад нечаканасці разгубіліся, але нехта сказаў: «Хадзем у ваенкамат. Трэба паспець на фронт!..» На фронт шчуплага хлапчука Арсенія адразу не ўзялі: было яму ўсяго 16 гадоў. Тады Люцко звярнуўся на хімзавод, прыбавіў сабе гады, і яго залічылі ў народнае апалчэнне. Разам з ім у атрады апалчэння ўступілі землякі — беларускія падлеткі, якія вучыліся ў Ленінградзе. Яны атрымалі ў ваенкамаце вінтоўкі Мосіна і адправіліся на перадавую тушыць пажары ад бамбёжак, гасіць запальныя бомбы, засыпалі іх пяском, выкідвалі ў бочку з вадой. Дарэчы, за гады блакады ў горадзе на Няве загінула каля 12 тысяч беларускіх падлеткаў. І толькі ў наш час яны перазахаваны на Піскароўскіх могілках, і там ім узведзены помнік.

...Пачалася гераічная абарона горада. Немцы абстрэльвалі горад з буйнакалібернай цяжкай артылерыі, танкавыя атакі ішлі адна за адной, а горад стаяў, як скала.

Арсеній Люцко ўзгадваў адзін эпізод блакады, якому ён быў сведкам. Грузавая машына везла хлеб у магазін, але ў яе трапіў снарад. Аўтамабіль быў разбіты, а буханкі хлеба рассыпаліся — умовы вельмі спрыяльныя для крадзяжу. Але галодныя блакаднікі сабралі хлеб і выставілі ахову.

Падраздзяленне, у якое быў залічаны Люцко, паслалі на так званую лінію Манергейма для рэканструкцыі абаронных умацаванняў. Байцы здымалі бранявыя каўпакі, умацоўвалі амбразуры, узводзілі драцяныя агароджы. Блакаднікі харчаваліся вельмі дрэнна — 200 грамаў хлеба на дзень.

У адзін з баёў каля пасёлка Пушкіна Арсенія параніла ў жывот і нагу. Лячыўся ён у сваім інтэрнаце. Раненне абцяжарыла дыстрафія: юны салдат меў вагу 47 кілаграмаў. Па дарозе жыцця праз Ладагу ў пачатку 1942 года параненага эвакуіравалі на Вялікую зямлю, залічылі ў ваенна-інжынернае вучылішча малодшага камандзірскага саставу.

У першай палове 1943 года сяржант Арсеній Люцко прыбыў у 27-ы асобны інжынерна-сапёрны батальён на Паўднёвы фронт. Потым была сфарміравана асобная 12-я штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада. Яна была рэзервам Стаўкі галоўнага камандавання. Малады сяржант стаў камандзірам аддзялення ў 56-м батальёне. Ягоным узводным аказаўся былы слухач курсаў удасканальвання каманднага саставу інжынерных войскаў у Ленінградзе Мікалай Фамін. Ён стаў для Люцко настаўнікам у сапёрнай справе. Яны разведвалі і расчышчалі шлях да ўдарных сіл, для атакуючых. Фашысты баяліся сапёраў-штурмавікоў. Многія кіламетры па мінных палях, па-пластунску, адолеў Арсеній Люцко, часта пад ураганным абстрэлам ворага. Украіна, Малдова, Румынія, Балгарыя, Венгрыя, Аўстрыя — вехі ваеннага шляху ветэрана.

Цяжкія баі ішлі пры вызваленні Мелітопаля. Толькі за адзін дзень сапёры-штурмавікі знішчылі 12 танкаў, 6 з іх — «тыгры», і бронетранспарцёр. Падчас баёў за горад яны ўстанавілі 2500 мін, абясшкодзілі каля 7000 варожых выбуховых прылад. Сапёрна-штурмавой брыгадзе было прысвоена ганаровае званне «Мелітопальская». Больш як 150 салдат і афіцэраў брыгады ўзнагародзілі ардэнамі і медалямі. Люцко атрымаў падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Сёння цесную сувязь Арсеній Васільевіч трымае з 12 музеямі Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Югаславіі і іншых краін. Інфармацыя пра яго ўключана ў экспазіцыі гэтых музеяў.

**Вольга ФЯДЗЯШЫНА,** *г. Слуцк*

■

УНП 806000258

## ГОДОВОЙ БАЛАНС
### общества с ограниченной ответственностью «Альфа-Брокер» за 2013 год

220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, тел. 266-24-17

млн руб.

| АКТИВ | Код строки | На 31 декабря 2013 г. | На 31 декабря 2012 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 47 | 26 |
| Нематериальные активы | 120 | | |
| **Итого по разделу I** | 190 | **47** | **26** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 43 | 37 |
| в т.ч. Материалы | 211 | 43 | 37 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 5 | 5 |
| Краткосрочная дебиторская задолжность | 250 | 49 | 53 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 5 | 20 |
| **Итого по разделу II** | **290** | **102** | **115** |
| **БАЛАНС** | **300** | **149** | **141** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2013 г.** | **На 31 декабря 2012 г.** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 3 | 3 |
| Добавочный капитал | 450 | 25 | 25 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 67 | 26 |
| **Итого по разделу III** | 490 | **95** | **54** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **Итого по разделу IV** | 590 | - | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 54 | 87 |
| в т.ч. | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 5 | 3 |
| по налогам и сборам | 633 | 22 | 27 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 4 | 3 |
| по оплате труда | 635 | 7 | 12 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 4 | |
| прочим кредиторам | 638 | 12 | 42 |
| **Итого по разделу V** | 690 | **54** | **87** |
| **БАЛАНС** | 700 | **149** | **141** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### общества с ограниченной ответственностью «Альфа-Брокер» за 2013 год

| Наименование показателей | Код строки | За 2013 год | За 2012 год |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 1580 | 1250 |
| Валовая прибыль | 030 | 1580 | 1250 |
| Управленческие расходы | 040 | (1162) | (835) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 418 | 415 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 9 | 1 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (98) | (46) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 329 | 370 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | | 3 |
| в т.ч. проценты к получению | 103 | | 3 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 11 | 21 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 11 | 21 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (11) | (21) |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (11) | (21) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | | |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130±140) | 150 | | 3 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±150) | 160 | 329 | 373 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (80) | (88) |
| Выплата дивидендов учредителям за 1–3 кв. 2013 г. | 201 | (182) | (259) |
| Чистая прибыль (убыток) (±160-170±180±190-200-201) | 210 | 67 | 26 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 67 | 26 |

В 2013 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Исакович Ириной Семеновной. Юридический адрес: 220117, г. Минск, пр. Любимова, д. 33, кв. 148, УНП 190524134 от 18.03.2004 г. Свидетельство о государственной регистрации от 18.03.2004 г. № 190524134 выдано Минским горисполкомом.

Аудиторское заключение: бухгалтерская (финансовая ) отчетность ООО «Альфа-Брокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Альфа-Брокер» на 1 января 2014 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 год, при этом совершенные ООО «Альфа-Брокер» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

IdeaBank
Отличная идея!

Наименование банка: ЗАО «Идея Банк»
www.ideabank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 апреля 2014 | на 1 апреля 2013 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 206 592,9 | 108 257,1 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 106 993,6 | 132 455,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 376 222,0 | 336 376,6 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 54 125,9 | 24 627,4 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 626 104,1 | 1 240 857,4 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 23,5 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 16,0 | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 86 063,4 | 42 589,7 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | | 121,8 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 126 486,5 | 43 956,8 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 2 582 627,9 | 1 929 242,5 |
| **14** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 141 837,6 | 143 802,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 2 008 839,4 | 1 463 769,3 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 1 042,8 | 83 374,6 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | | 4 118,1 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 16 985,5 | 16 851,6 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 2 168 705,3 | 1 711 916,2 |
| **22** | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 148 115,4 | 55 322,6 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 28 392,3 | 21 392,3 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 19 718,3 | 16 182,8 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 217 696,6 | 124 428,6 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 413 922,6 | 217 326,3 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 2 582 627,9 | 1 929 242,5 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 апреля 2014 | на 1 апреля 2013 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 260 391,1 | 126 801,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 182 850,1 | 132 789,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 77 541,0 | (5 987,6) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 67 970,5 | 131 669,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 23 105,7 | 8 634,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 44 864,8 | 123 035,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | - | (96,0) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 12 973,1 | 11 986,3 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 23,5 | (4 126,8) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 69 822,7 | 19 724,4 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 22 121,6 | 5 116,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 78 856,1 | 52 766,9 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 187,5 | 3 693,4 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 4 657,7 | 53 743,0 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 2 427,5 | 6 228,6 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 2 230,2 | 47 514,4 |

Председатель Правления Т.М.Медведева

Главный бухгалтер Е.М.Папушева

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»).
Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года. УНП 807000122

Страховая организация

## ЗАО «СК «ЭРГО»

Учетный номер плательщика: 100367422
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: г. Минск, ул. Пионерская, 2а

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 1 января 2014 года | На 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5 273 609 | 4 506 738 |
| Нематериальные активы | 120 | 18 807 | 16 306 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 22 774 520 | 1 246 066 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 1 915 157 | 42 009 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | 644 659 | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **30 626 752** | **5 811 119** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 175 733 | 117 131 |
| в том числе: материалы | 211 | 175 733 | 117 131 |
| незавершенное производство | 212 | - | - |
| прочие запасы | 213 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 220 | 33 503 | 38 110 |
| Залог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | 3 911 469 | 85 134 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 5 770 414 | 3 114 855 |
| в том числе: резерв незаработанной премии | 241 | 3 799 232 | 1 618 237 |
| резервы убытков | 242 | 1 971 182 | 1 496 618 |
| другие технические резервы | 243 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 23 722 551 | 2 668 256 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 35 631 692 | 29 451 414 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **69 245 362** | **35 474 900** |
| **БАЛАНС** | **300** | **99 872 114** | **41 286 019** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | на 1 января 2014 года | на 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 708 250 | 4 708 250 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 8 607 327 | 6 838 799 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | 68 896 | 24 901 |
| Добавочный капитал | 450 | 4 618 978 | 3 859 586 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 5 565 218 | 2 430 139 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **23 499 773** | **17 836 774** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | - | - |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 30 386 154 | 11 244 882 |
| Резервы убытков | 502 | 13 424 975 | 8 380 613 |
| Другие технические резервы | 503 | - | - |
| Иные страховые резервы | 504 | - | - |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 749 542 | 518 505 |
| Гарантийные фонды | 506 | - | - |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **44 560 671** | **20 144 000** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 17 004 000 | 1 133 093 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 372 123 | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **17 376 123** | **1 133 093** |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 308 000 | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 12 047 338 | 852 005 |
| в том числе: страхователям | 631 | - | - |
| страховым агентам и брокерам | 632 | 3 633 316 | 66 654 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 2 375 | 7 816 |
| по операциям перестрахования | 634 | 3 577 616 | 417 021 |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | - | - |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 3 130 672 | 452 |
| по авансам полученным | 637 | - | 101 |
